УЛ. ФРУНЗЕ 10
ИНСТИТУТ СОВ. СТРОИТ.
И ПРАВА
10.12 ЗВ 2

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 291 (5965) | 18 снежня 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

Выдатныя рэзультаты галасавання ў гістарычны дзень 12 снежня, бліскучая перамога сталінскага блока комуністаў і беспартыйных—грозная перасцярога ўсім тым, хто рыхтуе планы ўварвання на святую зямлю соцыялістычнай радзімы

УВЕСЬ СОВЕЦКІ НАРОД ГАЛАСАВАЎ ЗА ПАРТЫЮ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Сёння*) мы публікуем паведамленне Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет СССР аб колькасці галасоў, паданых 12 снежня за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Каля 90 мільёнаў выбаршчыкаў аддалі свае галасы кандыдатам непераможнага блока комуністаў і беспартыйных!

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР адбываліся тайным галасаваннем. Кожны працоўны, дасягнуўшы 18 год, галасаваў так, як яму падказвала яго грамадзянскае сумленне, яго свядомасць. Сапраўды свабодныя, сапраўды дэмакратычныя выбары былі гарантаваны для ўсіх выбаршчыкаў Совецкага Саюза. І совецкі народ аднадушна прагаласаваў за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за партыю Леніна—Сталіна!

Друкуемыя сёння ў паведамленні Цэнтральнай выбарчай камісіі лічбы будзе доўгія гады памятаць уся наша краіна, усё чалавецтва. Гэтыя лічбы—сведчанне выдатнейшага аднадушша, бязмежнага давер'я совецкага народа да сваёй большэвіцкай партыі. Дзе яшчэ ёсць у свеце партыя, якая атрымала-б такое ўсенароднае адабрэнне сваёй унутранай і знешняй палітыкі? Такой партыі ў капіталістычным свеце няма і быць не можа. Такая партыя ёсць толькі ў краіне пераможнага соцыялізма, — гэта партыя Леніна—Сталіна!

Не гаворачы ўжо аб краінах, дзе пануе фашызм і дзе выбары даўно ператварыліся ў суцэльную камедыю і надругання над народам, ні ў адной з так называемых дэмакратычных буржуазных краін ніколі ні адна партыя не атрымлівала на парламенцкіх выбарах адабрэнне сваёй палітыкі хаця-б у аднолькавай большасці народа.

У краіне Советаў, першай і пакуль адзінай краіне, дзе перамог соцыялізм, увесь совецкі народ згуртаван вакол адной, роднай партыі, вакол партыі большэвікоў. Выбары 12 снежня гэта прадэманстравалі з выключнай яснасцю і выразнасцю. «У нас няма процістаўляючых сябе адна адной партый, таксама-ж, як у нас няма процістаячых адзін аднаму класа капіталістаў і класа эксплоатуемых капіталістамі рабочых. Наша грамадства складаецца выключна з свабодных тружанікаў горада і вёскі — рабочых, сялян, інтэлігенцыі». (Сталін).

12 снежня совецкі народ, галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, галасаваў за партыю Леніна — Сталіна, галасаваў за совецкі ўрад, на чале якога стаяць выпрабаваныя большэвікі.

12 снежня, апускаючы свой бюлетэнь, кожны выбаршчык галасаваў не толькі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, выстаўленых і зарэгістраваных у яго выбарчай акрузе, — ён галасаваў за партыю Леніна—Сталіна, за ўсю яе ўнутраную і знешнюю палітыку.

Кожны грамадзянін свабоднай нашай краіны ў дзень 12 снежня ў думках аглядваў пройдзены гераічны шлях барацьбы і перамог за 20 год Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі, пройдзены пад мудрым važ... кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, і гаварыў:

— Так, я адабраю ўвесь гэты шлях, так, я галасую за партыю большэвікоў, якая ў цяжкія годы царызма арганізавала і згуртавала рабочы клас, якая пераможна павяла рабочых і сялян нашай краіны на штурм капіталізма, якая правяла народы Совецкага Саюза за 20 год праз строй цяжкіх выпрабаванняў і труднасцей і прывяла да сёнешняга шчаслівага соцыялістычнага дня.

Совецкі народ сваім аднадушным галасаваннем адобрыў усю гаспадарчую палітыку нашай партыі, якая ператварыла нашу радзіму з краіны адсталасці і сярэднявякоўя, цемры і бескультур'я, жабрацтва, бяспраўя і прыгнечання працоўных, якой была старая Расія, у перадавую, культурную, магутную соцыялістычную дзяржаву. Народ галасаваў за партыю Леніна—Сталіна, якая гарантавала кожнаму совецкаму чалавеку права на працу, на адпачынак, на асвету, на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці. Аднадушнае галасаванне было адказам народа сваёй партыі, яе Цэнтральнаму Камітэту і таварышу Сталіну — творцу самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі.

Совецкі народ аднадушным галасаваннем адобрыў няўстанную, нястомную барацьбу партыі і яе сталінскага Цэнтральнага Камітэта, слаўных карацельных органаў нашай радзімы з ворагамі народа, трацкісцка-бухарынскімі фашысцкімі агентамі, буржуазнымі нацыяналістамі, усімі тымі, хто імкнецца надзець ярмо капіталізма на свабодныя народы Совецкага Саюза. Рэзультаты галасавання лішні раз даказваюць маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа, поўную ізаляцыю ад народа яшчэ не выкрытых дыверсантаў і разведчыкаў.

Совецкі народ палкам і поўнасцю адобрыў сваім аднадушным галасаваннем знешнюю палітыку нашай партыі і ўрада, якія ўжо 16 год аберагаюць краіну ад ваенных сутычак, непахісна стаяць на варце мірнай працы. Мы не хочам вайны,— сказалі 12 снежня 90 мільёнаў выбаршчыкаў Совецкага Саюза. — мы палкам падтрымліваем усе мерапрыемствы партыі Леніна—Сталіна па ўмацаванню абароннай магутнасці нашай радзімы, мы ўсе гатовы да бою і па першаму закліку партыі і ўрада гатовы разам з нашай доблеснай Чырвонай Арміяй рынуцца на любога ворага, гатовы разграміць яго на яго ўласнай тэрыторыі. Гора таму, хто пасягне на нашу совецкую зямлю! Ён на сабе адчуе несакрушальную сілу жалезнага блока комуністаў і беспартыйных!

Выдатнейшыя рэзультаты галасавання ў рэспубліках-фарпостах — на Украіне, у Беларусі, Узбекістане — грозная перасцярога ўсім тым, хто па той бок нашых граніц, булучы асеплен нянавісцю і злобай, рыхтуе планы ўварвання на святую зямлю соцыялістычнай краіны.

Выбары ў Вярхоўны Совет былі велізарнейшай праверкай для нашай партыі. Праверылася сіла сувязі партыі з народам. І выбары закончыліся бліскучай перамогай партыі Леніна—Сталіна!

Цэнтральны лозунг выбарчай кампаніі — цесны блок комуністаў і беспартыйных—лозунг, высунуты па ініцыятыве таварыша Сталіна, быў з захапленнем успрыніт усімі працоўнымі нашай бацькаўшчыны. Непарушны выбарчы саюз комуністаў і беспартыйных ва ўсіх раёнах нашай краіны забяспечыў бліскучую перамогу.

12 снежня совецкі народ уручыў свайму авангарду, сваёй роднай большэвіцкай партыі вялікі мандат, на якім 90 мільёнаў выбаршчыкаў — рабочы клас, совецкае сялянства, інтэлігенцыя нашай радзімы — начарталі:

— Вядзі нас, партыя, вядзі нас, дарагі, любімы таварыш Сталін, да новых перамог комунізма, да таржаства вялікай справы Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна на ўсім зямным шары!

(«ПРАВДА»).

*) Гл. «Звязду» ад 17 снежня.

ПАСЯДЖЭННЕ АКРУГОВАЙ КАМІСІІ ВАЛАДАРСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

УРУЧЭННЕ ТАВ. А. А. ЖДАНАВУ ПАСВЕДЧАННЯ АБ ВЫБРАННІ ЯГО ДЭПУТАТАМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ЛЕНІНГРАД, 16 снежня. (БЕЛТА). Сёння адбылося пасяджэнне акруговай выбарчай камісіі Валадарскай выбарчай акругі. На пасяджэнні прысутнічалі тав. А. А. Жданаў і прадстаўнікі грамадскасці.

Старшыня камісіі тав. Нікішына пад апладысменты прысутных уручыла тав. Жданаву пасведчанне аб выбранні яго дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР ад працоўных Валадарскай акругі Ленінграда.

Аб правядзенні гадавой справаздачнай кампаніі ў калгасах за 1937 год

Наркамзем СССР прапанаваў закончыць складанне гадавых справаздач у калгасах і правядзенне рэвізійнымі камісіямі поўнай дакументальнай рэвізіі гаспадарчай дзейнасці калгасаў за 1937 год не пазней 1 лютага 1938 года. Складзеная гадавая справаздача павінна быць разгледжана і зацверджана агульным сходам у прысутнасці не менш двух трацей членаў сельскагаспадарчай арцелі не пазней 8 лютага.

Праўленні калгасаў абавязаны прадставіць гэтыя справаздачы ў адпаведныя арганізацыі не пазней 10 лютага 1938 года.

Падвядзенне вынікаў работы калгасаў за 1937 год і размеркаванне даходаў павінны быць праведзены ў адпаведнасці з Прыкладным статутам сельскагаспадарчай арцелі і пры самым шырокім удзеле ўсіх калгаснікаў.

ВЕЛІЗАРНЫ ПОСПЕХ ФІЛЬМА „ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ"

Гісторыка-рэволюцыйны мастацкі фільм «Ленін у Кастрычніку», які з 12 снежня дэманструецца ў кінотэатры «Пролетарый», карыстаецца сярод працоўных сталіцы БССР выключным і неаслабным поспехам.

Штодзённа паступаюць заяўкі ад прадпрыемстваў, устаноў, школ на калектыўны прагляд фільма. Карціну ўжо глядзелі рабочыя завода «Ударнік», друкарні імя Сталіна, кафельнага завода, члены промарцелі імя Крупскай, студэнты будаўнічага тэхнікума і інш. — усяго каля 20.000 чалавек.

18 снежня арганізуюцца два дадатковыя сеансы. З 19 снежня ў кінотэатры будуць штодзённыя сеансы спецыяльна для школьнікаў.



11 снежня ў Дзяржаўным Акадэмічным ордэна Леніна Вялікім тэатры адбыўся перадвыбарчы сход выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі Масквы. На сходзе выступіў з прамовай першы кандыдат у Вярхоўны Совет СССР, правадыр народаў таварыш Іосіф Вісарыёнавіч Сталін, спатканы бурнымі і захапляючымі прывітаннямі выбаршчыкаў. НА ЗДЫМКУ: таварыш І. В. Сталін на трыбуне.

Фото Ф. Кіслова і С. Ласкутова (СФ).

МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ

ОРША, 17 снежня. (Кар. «Звязды»). На плошчы, ля помніка Уладзіміру Ільічу Леніну сёння адбыўся 30-тысячны мітынг працоўных Аршаншчыны. Сакратар райкома партыі тав. Чэрнякоў прадастаўляе слова дэпутату ў Совет Саюза ад Аршанскай выбарчай акругі лейтэнанту-ордэнаносцу Даніілу Якаўлевічу Навіцкаму. Выбаршчыкі горача вітаюць свайго дэпутата ў Вярхоўны Совет.

Прамова тав. Навіцкага пакрываецца бурнымі, доўга незмаўкаемымі апладысментамі і прывітальнымі воклічамі ў гонар партыі большэвікоў, у гонар бліскучай перамогі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, у гонар вялікага правадыра таварыша Сталіна. Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза тав. Федарэнка агалошвае паведамленне камісіі, што працоўныя Аршаншчыны аднадушна выбралі ў Вярхоўны Совет СССР кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных тт. Навіцкага, Жабрава і Шышкова і тут-жа ўручае мандат дэпутата Вярхоўнага Совета СССР тав. Навіцкаму.

Пасля мітынга адбылася ўнушальная дэманстрацыя працоўных.

Стройнымі калонамі, з факеламі, чырвонымі сцягамі, лозунгамі, транспарантамі, партрэтамі правадыроў, дэманстранты прадэфіліравалі па галоўнай вуліцы горада.

АГУЛЬНАГАРАДСКІ МІТЫНГ У СЛУЦКУ

У Слуцку адбыўся шматлюдны мітынг працоўных горада, прысвечаны бліскучай перамозе блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет.

Выступаўшыя на мітынгу з радасцю гаварылі аб перамозе сталінскага блока, выказвалі глыбокую ўдзячнасць большэвіцкай партыі і вялікаму Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё ў краіне соцыялізма.

На мітынгу выступіў дэпутат Вярхоўнага Совета тав. Кулагін.

— Таварыш Сталін на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі, — адзначае тав. Кулагін, — гаварыў аб абавязках дэпутатаў і правах выбаршчыкаў. Мы павінны моцна памятаць гэтыя мудрыя сталінскія словы.

Я звяртаюся да вас, рабочыя і работніцы, з заклікам вышэй узняць сцяг барацьбы за выкананне промфінплана, за ўзняцце якасці працы, за ўзняцце працоўнай дысцыпліны, за высокую прадукцыйнасць працы.

Я заклікаю ўсіх працоўных яшчэ больш згуртавацца вакол партыі Леніна—Сталіна, яшчэ больш змагацца за новыя перамогі. Выкрыем і знішчым усіх ворагаў народа — трацкісцка-бухарынска-зіноўеўскіх агентаў япона-германа-польскага фашызма. Будзем аказваць усямерную дапамогу нашым слаўным пагранічнікам у іх ганаровай рабоце па ахове совецкіх рубяжоў. Змяцём з твару зямлі совецкай усіх тых, хто перашкаджае нам будаваць шчаслівае жыццё.

ЧАТЫРОХТЫСЯЧНЫ МІТЫНГ У ШКЛОВЕ

ШКЛОЎ. 4000 працоўных горада Шклова з чырвонымі сцягамі, плакатамі і лозунгамі сабраліся на мітынг, каб выказаць сваю радасць і задаволенне вынікамі галасавання ў Вярхоўны Совет СССР.

Мітынг адкрывае старшыня райвыканкома тав. Козінцаў. Калі ён гаворыць аб першым дэпутаце ў Вярхоўны Совет — таварышу Сталіну, гучныя апладысменты і крыкі «ура» патрасаюць плошчу. З усіх канцоў нясуцца воклічы: «Няхай жыве геніяльны творац Канстытуцыі таварыш Сталін!», «Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!», «Гарачае прывітанне лепшаму другу працоўнай моладзі таварышу Сталіну!».

На трыбуне малады рабочы папяровай фабрыкі «Спартак» тав. Ступін.

— 12 снежня, — кажа ён, — шматмільённы працоўны народ яшчэ раз прадэманстраваў сваю бязмежную любоў і адданасць комуністычнай партыі, совецкаму ўраду, мудраму Сталіну. Совецкія грамадзяне аднадушна аддалі свае галасы кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных. Бліскучыя вынікі тайнага галасавання яскрава гавораць аб магутным адзінстве совецкага народа, аб яго гатоўнасці ў любы час, па першаму закліку партыі і ўрада, грудзьмі стаць на абарону соцыялістычнай радзімы.

СЛОВЫ СТАЛІНА—НАША ПРАГРАМА

У выніку тайнага галасавання я выбран дэпутатам у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР ад Гомельскай сельскай выбарчай акругі. Гэта вялікае давер'е народа я перш за ўсё адношу да партыі Леніна—Сталіна, членам якой я з'яўляюся ўжо 18 год. Велізарна радасць мая, што выбары ва ўсёй нашай неабсяжнай краіне прайшлі, як выдатнейшая дэманстрацыя адзінства і згуртаванасці совецкага народа вакол роднай большэвіцкай партыі, гарачай любві і адданасці вялікаму, любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Наш дарагі правадыр таварыш Сталін заўсёды вучыць усіх членаў партыі, усіх кіраўнікоў — малых і вялікіх — даражыць давер'ем народа. У сваёй выдатнай прамове перад выбаршчыкамі Сталінскай акругі ён са здзіўляючай прастатой паказаў, якім павінен быць дэпутат. У нямногіх словах з велізарнай сілай ён выказаў так многа, што для кожнага чэснага чалавека, адданага соцыялістычнай радзіме, гэта — праграма дзейнасці, праграма барацьбы і перамог нашай соцыялістычнай радзімы.

Я прыношу сваю глыбокую падзяку працоўным Гомельскай гарадской выбарчай акругі, аказаўшым мне такі высокі гонар і давер'е. Я абяцаю, што ва ўсім маім жыцці і рабоце словы Сталіна будуць для мяне праграмай. Усе свае сілы, усё жыццё сваё не пашкадую, аддаць на карысць нашай соцыялістычнай радзімы.

Подлыя ворагі народа доўга арудавалі ў Гомельскім гарадскім совеце. Яны нанеслі нямала шкоды гарадской гаспадарцы. Пяршэйшым сваім абавязкам, як старшыні горсовета і як дэпутата Совета Нацыянальнасцей, лічу дзень і ноч працаваць над ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва. Работы —непачаты край, работы вялікай і адказнай. Натхнёны сталінскай прамовай і тым давер'ем, якое аказана мне зараз, я хачу працаваць і працаваць, каб і ў далейшым быць верным сынам партыі Леніна — Сталіна, сваёй соцыялістычнай радзімы.

ФІНАГЕНАЎ Міхаіл Цімафеевіч, дэпутат Совета Нацыянальнасцей ад Гомельскай гарадской выбарчай акругі, старшыня Гомельскага горсовета.

ДАВЕДКА АБ ТЫМ, НА ЯКУЮ КОЛЬКАСЦЬ ВЫБАРШЧЫКАЎ АПІРАЕЦЦА ЎРАД У СССР І Ў ІНШЫХ КРАІНАХ

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР, якія адбываліся на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні, паказалі ўсяму свету сілу і магутнасць совецкага ладу, непахіснае давер'е і любоў народаў нашай краіны да партыі Леніна—Сталіна. **На выбарах 12 снежня 1937 года блок комуністаў і беспартыйных атрымаў бліскучую перамогу. Ні адзін буржуазны ўрад не мог і марыць аб такіх выніках выбарчай кампаніі, якія атрымалі мы на выбарах Вярхоўнага Совета. Ва ўсіх без выключэння выбарчых акругах прайшлі кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных!**

Насельніцтва нашай краіны паказала надзвычайна ўзросшую палітычную актыўнасць. Да выбарчых урнаў з'явілася 96,8 проц. насельніцтва, якое карыстаецца выбарчым правам. Такой актыўнасці ў выбарчых кампаніях не ведае ні адна дзяржава. Пануючыя ў капіталістычных краінах класы зацікаўлены ў палітычнай пасіўнасці насельніцтва. «У нас, у нашай краіне, наадварот, выбары праходзяць у зусім іншай абстаноўцы. У нас няма капіталістаў, няма памешчыкаў, стала-быць, і няма даўлення з боку маемных класаў на немаемных. У нас выбары праходзяць у абстаноўцы супрацоўніцтва рабочых, сялян, інтэлігенцыі, у абстаноўцы ўзаемнага іх давер'я, у абстаноўцы, я сказаў-бы, узаемнай дружбы, бо ў нас няма капіталістаў, няма памешчыкаў, няма эксплоатацыі і няма каму, уласна, давіць на народ для таго, каб сказіць яго волю». (Сталін).

Выбары ў СССР з'яўляюцца сапраўды свабоднымі і адзіна дэмакратычнымі ва ўсім свеце. Партыя Леніна—Сталіна зрабіла ўсё неабходнае, каб кожны выбаршчык мог выканаць свой пачэсны грамадзянскі абавязак.

Народы СССР паказалі 12 снежня 1937 года высокую палітычную зрэласць. Яны аднадушна галасавалі за партыю Леніна—Сталіна, за совецкі ўрад. Ні адзін урад у свеце ніколі не апіраўся на такую колькасць выбаршчыкаў, на якую апіраецца ўрад краіны Советаў. Ні адна партыя ў свеце не мела такога высокага процанта галасоў **ЗА**, які атрымала партыя большэвікоў.

Прадставім слова лічбам. Ніжэй мы прыводзім даныя аб колькасці галасоў, паданых на выбарах за ўрадавыя партыі ў Англіі, ЗША, Францыі і Японіі, а таксама ў СССР за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

ДАНЫЯ АБ ЛІКУ ГАЛАСОЎ, АТРЫМАНЫХ УРАДАВЫМІ ПАРТЫЯМІ

Краіны	Дата выбараў	Галасавала: Лік	Галасавала: У проц. да ліку выбаршчыкаў	Падана галасоў за правячую партыю: Лік	Падана галасоў за правячую партыю: У проц. да ліку галасаваўшых
Англія	Парламенцкія 1935 г.	22.001.837	71,9	11.791.461	53,6
З Ш А	Прэзідэнцкія 1936 г.	45.812 155	83,3	27.752.000	60,5
Францыя	Парламенцкія 1936 г.	9.938.058	83,9	5.628.921	56,6
Японія	Парламенцкія 1937 г.	10.204.127	69,9	Мінсейто — 3.667.783 Сейюкай — 3.584.276	71,1
СССР	**12 снежня 1937 г.**	**91.113.153**	**96,8**	**У Совет Саюза 89.844.271**	**98,6**
		За блок комуністаў і беспартыйных		**У Совет Нацыянальнасцей 89·063.169**	**97,8**

Як чытач бачыць, мы не прыводзім даных па Польшчы і Германіі. Галасаванне ў Польшчы за так званы «беспартыйны блок прыхільнікаў урада» не паказальна, бо **насельніцтва Польшчы байнатавала выбары, у галасаванні ўдзельнічала толькі 46,6 проц. выбаршчыкаў.** Што датычыць фашысцкай Германіі, то там насельніцтва пазбаўлена якіх-бы там ні было дэмакратычных правоў і свабод.

Аб чым гаворыць прыведзеная намі табліца?

У Англіі на парламенцкіх выбарах 1935 года перамог блок кансерватараў з нацыянал-лібераламі і нацыянал-лейбарыстамі. Пад эгідай кансерватараў гэты блок сабраў 11.791.461 голас, што складае ўсяго 53.6 проц. ад ліку галасаваўшых. Звыш 10 мільёнаў чалавек — некалькі менш паловы ўсіх выбаршчыкаў!— галасавалі супроць панавання кансерватараў. Класавыя супярэчнасці ў Англіі надзвычайна абвастраюцца. Урад так званага «нацыянальнага блока» апіраецца на надзвычайна нязначную большасць выбаршчыкаў.

У Злучаных Штатах Амерыкі на прэзідэнцкіх выбарах 1936 года дэмакраты атрымалі велізарную перамогу,—яны сабралі 27,7 млн. галасоў, што складае 60,5 проц. усіх галасаваўшых. Але другая буржуазная партыя ЗША, якая канкурыруе з Рузвельтам, — мы маем на ўвазе рэспубліканскую партыю,—сабрала 16,6 млн. галасоў. Калі ўлічыць, што астатнія галасы разбіліся паміж рознымі партыямі і групамі, то будзе зразумела складанасць абстаноўкі ў ЗША, дзе насельніцтва па сутнасці справы разбіта на некалькі лагераў. Урад ЗША ніяк не можа сказаць, што ён апіраецца на ўвесь народ, на ўсю нацыю. Такое права не дана ні аднаму буржуазнаму ўраду. Так можа гаварыць толькі ўрад краіны Советаў, які апіраецца на ўвесь вялікі працоўны народ, які атрымаў мандат усёй нацыі.

У Францыі на парламенцкіх выбарах 1936 года перамог народны фронт. Ён сабраў 5,6 млн. галасоў з ліку 9,9 млн. выбаршчыкаў, г. зн. 56,6 проц. Гэта была велізарная перамога. Урад народнага фронта найбольш блізка, з усіх урадаў капіталістычных краін, выражае інтарэсы народа. Але і ён не мае тых глыбокіх карэнняў у краіне, якія мае ўрад краіны Советаў. 20 год пролетарскай рэволюцыі і вялікая перамога соцыялізма сказаліся так глыбока на палітычным і маральным адзінстве насельніцтва, што Совецкі Саюз ператварыўся ў непрыступную крэпасць соцыялізма.

У Японіі на выбарах у 1937 годзе галасавала за партыі сейюкай і мінсейто каля 7.200 тысяч чалавек. Складаючы большасць у парламенце, гэтыя партыі разыгрываюць часамі апазіцыю да ўрада, на справе падтрымліваючы яго авантуры. Выбарчая сістэма Японіі і іншых буржуазных краін ілюструе народную волю ў крывой люстры. Але і пры гэтай умове пануючыя партыі Японіі апіраюцца толькі на 71 проц. удзельнічаўшых у галасаванні.

Толькі ў Совецкім Саюзе народ выражае сваю волю адкрыта. Усеагульныя выбары ў Вярхоўны Совет праведзены найбольш дэмакратычна. Дзень 12 снежня 1937 года стаў днём сапраўды ўсенароднага свята. За блок комуністаў і беспартыйных, за партыю Леніна—Сталіна галасавала: у Совет Саюза 89,8 млн. чалавек, у Совет Нацыянальнасцей — 89 млн. чалавек. Урад Советаў з'яўляецца адзіным у свеце, за які галасавала 98,6 проц. усяго ліку ўдзельнічаўшых у галасаванні.

Наш народ прагаласаваў за перамогу соцыялізма ў нашай краіне, за таржаство калгаснага ладу, за ўсю ўнутраную і знешнюю палітыку сталінскага Цэнтральнага Камітэта і совецкага ўрада. Народы нашай краіны паказалі, што яны ганарацца сваёй уладай і будуць яе абараняць усімі сродкамі!

Урады Англіі, ЗША, Францыі і Японіі атрымалі ў сукупнасці каля 50 млн. галасоў. **Совецкі ўрад атрымаў амаль удвая больш галасоў, чым усе пералічаныя ўрады разам узятыя!** Такой перамогі на выбарах не ведаў і не можа ведаць ні адзін буржуазны ўрад. Вялікая соцыялістычная рэволюцыя не толькі разняволіла народы нашай краіны ад улады капіталістаў і памешчыкаў, але яна ўжо паспела паказаць народу ўсе перавагі новага ладу, несучага насельніцтву шчаслівае і заможнае жыццё.

Совецкі народ галасаваў за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, за ўладу советаў, за большэвіцкую партыю, за вялікага правадыра Сталіна.

Совецкі ўрад — самы моцны і самы трывалы ў свеце ўрад! Совецкі ўрад — сапраўды народны ўрад!

ШЫРОКА РАСПАЎСЮДЖВАЦЬ БАГАТЫ ВОПЫТ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ АГІТАЦЫІ

ЗАМАЦУЕМ ДАСЯГНУТЫЯ ПОСПЕХІ

Партыйная арганізацыя Менскай гарадской электрастанцыі № 2 працавала ў часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР на 82 выбарчым участку.

Увесь участак, кожная вуліца, кожны двор былі забяспечаны нашай увагай. Усюды быў комуніст, які адказваў за правядзенне падрыхтоўчай работы. На кожнай вуліцы, апрача адказнага за ўсю работу комуніста, мы вылучылі штат агітатараў. Усяго працавала 27 агітатараў, з іх 17 комуністаў, 8 комсамольцаў і 2 беспартыйныя.

Партыйны кабінет нашай арганізацыі ў гэты адказны перыяд быў ператворан у апорны агітацыйны пункт. Тут праводзілася сістэматычная работа з агітатарамі і ўстаноўлена была штодзённая кансультацыя і дзяжурства ад 5 да 9 гадзін вечара. З агітатарамі партыйны камітэт правёў 7 заняткаў.

Агітатары па ўсіх пытаннях выбараў у арганізаваных намі 24 гуртках, якімі было ахоплена 600 неарганізаваных выбаршчыкаў, праводзілі па двое заняткаў па кожнай тэме ў паасобку. Была выключная зацікаўленасць да наведвання заняткаў. Палітычная актыўнасць выбаршчыкаў расла на вачах, бо кожны наш агітатар, добрасумленна адносячыся да сваіх абавязкаў, арганізоўваў масы выбаршчыкаў, палітычна выхоўваў іх.

Партыйная арганізацыя апрача канкрэтнай агітацыйнай работы непасрэдна на ўчастку правяла рад масавых мерапрыемстваў. Намі праведзены тры вялікія вечары (два ў Доме партактыва і адзін у клубе электрастанцыі № 1), на кожным з якіх прысутнічала ад 500 да 700 чалавек. Не засталося ні аднаго выбаршчыка, які-б не быў ахоплены агітацыяй і масавымі мерапрыемствамі. Было праведзена 2 спецыяльных палітдні з пытаннем аб выбарах, праведзены два вечары моладзі, тры сходы жонак рабочых і два даклады для выбаршчыкаў аб міжнародным становішчы. Для хатніх гаспадынь былі арганізаваны экскурсіі ў Дом урада і Дом Чырвонай Арміі.

Партыйная арганізацыя добра скарыстала і прыезды агітбрыгады, што садзейнічала агітацыі за нашых кандыдатаў тт. Варашылава і Ванеева. У клубе перад кожным сеансам мы праводзілі кароценькія гутаркі аб нашых кандыдатах і аб парадку ўдзелу ў выбарах. Скарысталі і радыёвузел, які да гэтага часу амаль не працаваў. Вузел абслугоўваў 85 радыёкропак. Партком для скарыстання гэтага сродку масавай агітацыі вызначыў адказнага комуніста, які асвятляў усе пытанні выбараў.

Усе мерапрыемствы, якія праводзіла партыйная арганізацыя, былі накіраваны на ўзняцце палітычнай актыўнасці і палітычнага ўздыму выбаршчыкаў.

У дзень выбараў нашы выбаршчыкі не мелі незразумелых пытанняў і на выбары ішлі з велізарнейшай радасцю і гордасцю за сваю краіну, за сваю большэвіцкую партыю. Вынікі нашай работы далі сябе адчуваць у часе галасавання. У галасаванні па нашаму ўчастку прынялі ўдзел усе 100 проц. выбаршчыкаў. Яны аднадушна аддалі свае галасы за нашага любімага наркома таварыша Варашылава.

Гэта велізарны поспех, якога наша партарганізацыя дабілася на ўчастку ў выніку правядзення агітацыйна-масавай работы. У разультаце гэтай работы ў нас выраслі здольныя агітатары (Радзюк, Каўко, Лойка і інш.).

Усе нашы агітатары зараз застаюцца на ўчастку. Яны працягваюць агітацыйную работу па растлумачэнню працоўным рашэнняў партыі і ўрада. Добра было-б, калі-б Сталінскі райком партыі склікаў перыядычна агітатараў кожнай партарганізацыі ў паасобку і кіраваў імі, перадаючы вопыт і даючы інструктаж. Наша задача — замацаваць той вялікі палітычны ўздым і палітычную актыўнасць, якога мы дасягнулі за час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

М. КАЦ,
сакратар парткома МГЭС № 2.



Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ
АКРУГОВАЯ ПА ВЫБАРАМ
У СОВЕТ САЮЗА
ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
№ 180
13 снежня 1937 г.
г. Менск БССР

Асабісты подпіс

ПАСВЕДЧАННЕ

На падставе арт. 44, п. „ж“ і арт. 105 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ і пратакола галасавання Акруговай выбарчай камісіі Менскай гарадской Акруговая па выбарам у Совет Саюза выбарчая камісія сведчыць, што таварыш

Варашылаў Клімент Ефрэмавіч

абран дэпутатам Совета Саюза.

Старшыня Акруговай па выбарам у Совет Саюза выбарчай камісіі (Папкоў)

Сакратар Акруговай па выбарам у Совет Саюза выбарчай камісіі (Каштанаў)

Пасведчанне, якое пасылаецца Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву аб тым, што ён выбран дэпутатам у Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР ад Менскай гарадской выбарчай акругі.

БОЛЬШЭВІЦКАЯ АГІТАЦЫЯ ЗАБЯСПЕЧЫЛА ПЕРАМОГУ

Мне хочацца падзяліцца сваім вопытам работы, расказаць аб тых метадах большэвіцкай агітацыі, якія забяспечылі нам стопроцантны ўдзел у галасаванні ўсіх выбаршчыкаў нашага ўчастка.

Згрупавала я вакол сябе 29 агітатараў — комуністаў, комсамольцаў, беспартыйных актывістаў. Да кожнага з іх прымацавала па 5—6 дамоў.

Калі мы ўпершыню з'явіліся на сваім ўчастку, выбаршчыкі нас спаткалі насцярожліва, недаверліва.

— З намі ніколі не гутарылі, для чаго ўсё гэта патрэбна? — такія рэплікі чулі мы вельмі часта.

Цэлымі гадзінамі агітатары на кватэрах вялі гутаркі з выбаршчыкамі, расказвалі ім аб нашых дасягненнях, аб партыі, аб вялікім Сталіну, аб прадстаячых выбарах.

Прайшла пяцідзёнка. Зусім змянілася абстаноўка на ўчастку і адносіны да нас. З'явіліся першыя актывісты ў гуртках. Вось Максімава — старушка, мае сына лётчыка. Яна — стараста гуртка — прыгожа прыбрала кватэру, дзе праводзіліся заняткі. Яна рыхтавалася да гэтых заняткаў бадай больш за агітатараў. Яе гурток заўсёды збіраўся своечасова.

Другі наш стараста — хатняя гаспадыня Калтунова з урочышча «Тры карчмы» — стала выключна актыўнай удзельніцай гуртка.

18 лістапада ў клубе імя Сталіна мы арганізавалі варашылаўскі вечар калектыва фабрыкі «Комунарка» разам са сваімі выбаршчыкамі з прымацаванага ўчастка. Тут выступала шмат таварышоў з расказамі і ўспамінамі аб таварышу Варашылаву. Пасля быў канцэрт.

Праз некалькі дзён у тым-жа клубе мы арганізавалі сустрэчу нашых выбаршчыкаў з дэпутатам Совета Нацыянальнасцей тав. Ванеевым.

Па выхадных днях мы арганізоўвалі экскурсіі, знаёмілі выбаршчыкаў з новым Менскам. Раз'язджалі на аўтамашынах, разглядалі Дом урада, Палац піонераў, Дом Чырвонай Арміі, дом, дзе адбываўся першы з'езд РСДРП. З імі раз'язджаў агітатар, добра ведаючы горад. Выбаршчыкі-экскурсанты засталіся вельмі задаволенымі.

Пяць нумароў выпушчанай шматтыражкі на выбарчым участку ў многім дапамаглі нашай рабоце. У ёй прымалі ўдзел шмат хатніх гаспадынь, большасць якіх упершыню пісала ў газету.

Шырока скарысталі мы праекцыйны ліхтар. Атрымалі спецыяльную ленту здымкаў з жыцця і дзейнасці таварыша Варашылава. Пачаргова дэманстравалі іх на кватэрах выбаршчыкаў.

На наступным этапе нашай агітацыі мы пусцілі па ўчастку агітацыйную машыну. Першы рэйс яна зрабіла ў інтэрнат фурнітурнага завода. Машына была прыгожа аформлена партрэтамі правадыроў партыі, плакатамі аб дні выбараў. Прыязджае яна на ўчастак, духавы аркестр грае, агітатар праводзіць гутарку, расказвае біяграфіі кандыдатаў. Пасля — кінапастаноўка «Мы з Кранштата», або іншая.

Актыўнасць выбаршчыкаў усё ўзрастала. Бывала, не прыйдзе агітатар на заняткі па хваробе ці па іншай якой уважлівай прычыне: прыходзіць да мяне цэлая делегацыя жанчын з прэтэнзіяй — чаму ў суседзяў ідуць заняткі, а ў нас няма.

З якой радасцю ішлі нашы выбаршчыкі на сустрэчу з таварышам Варашылавым! Колькі было потым радасных размоў. — «Мы бачылі і чулі таварыша Варашылава».

Вывучэнню Зварота ЦК ВКП(б) да ўсіх выбаршчыкаў мы аддалі вялікую ўвагу. Літаральна на кожнай кватэры праводзіліся гутаркі.

10 снежня комсамольская арганізацыя фабрыкі «Комунарка» правяла лыжны паход па вуліцах участка з плакатамі аб дні выбараў.

Настаў вялікі дзень выбараў. Ёсць народная прыказка: «Што пасееш, тое пажнеш». Рэзультат нашай большэвіцкай агітацыі даў выдатныя ўсходы. К гадзіне дня 12 снежня большасць выбаршчыкаў прагаласавала, засталіся толькі адны хворыя. К 12 гадзінам ночы ўсе 1.370 выбаршчыкаў нашага ўчастка выканалі свой грамадзянскі абавязак. Яны аддалі свае галасы за лепшых сыноў нашай радзімы — за жалезнага наркома абароны — таварыша Варашылава і за тав. Ванеева. Яны аддалі свае галасы за партыю, за Сталіна, за кандыдатаў блока комуністаў з беспартыйнымі.

Выбары скончыліся, але наша работа на ўчастку яшчэ не скончана. Я лічу, што партыйная арганізацыя фабрыкі павінна і ў далейшым падтрымліваць моцную сувязь з нашымі выбаршчыкамі. Вялікая работа намі праведзена, яе трэба замацаваць.

Софія Фёдараўна СНЕГІР,
даверанная асоба 24-га выбарчага ўчастка, зменны майстар фабрыкі «Комунарка».

МАЯ РАБОТА НА ЎЧАСТКУ

Яшчэ задоўга да выбараў у Вярхоўны Совет СССР партыйная арганізацыя менскай швейнай фабрыкі «КІМ» вылучыла мяне агітатарам на 40 выбарчы ўчастак.

З вялікай любоўю я пачаў сваю агітацыйную работу на ўчастку. Спачатку я азнаёміўся з жыхарамі прымацаваных да мяне дамоў № 4 і 6 па вуліцы Луначарскага. Арганізаваў гурток хатніх гаспадынь з 16 чал., з якімі пачаў заняткі па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Заняткі праходзілі з вялікім уздымам, акуратна наведваліся хатнімі гаспадынямі. Я сам адчуваў вялікі палітычны рост.

На занятках я карыстаўся рознымі пасобнымі матэрыяламі, якія характарызуюць упадак капіталістычнага грамадства, хлуслівасць буржуазнага «дэмакратызма» і інш. Адначасова я вельмі падрабязна ілюстраваў канкрэтнымі данымі нашы дасягненні за 20 год.

На канкрэтных прыкладах я паказваў, як пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і мудрага правадыра таварыша Сталіна заваёвана наша шчаслівае, радаснае жыццё.

Да дня выбараў слухачы майго гуртка былі добра падрыхтаваны. Не было ні адной хатняй гаспадыні, якая-б не ведала Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР». Яны з любоўю і гонарам аддалі свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў з беспартыйнымі, за любімага наркома абароны таварыша К. Е. Варашылава і за таварыша В. Г. Ванеева.

Поўная перамога блока комуністаў і беспартыйных на выбарах выклікала яшчэ большы ўздым палітычнай актыўнасці нашых выбаршчыкаў. Яны жадаюць, каб і надалей з імі пастаянна праводзілі заняткі ў гуртках.

Агітатар С. Ф. НАГЕЛЬ,
швейная фабрыка «КІМ».

ГУРТКІ ПАВІННЫ ПРАЦЯГВАЦЬ СВАЮ РАБОТУ

Раней, пры царскай уладзе, жанчына была забіта. Яна ведала толькі кухню і дзяцей.

Зараз мы, совецкія жанчыны, — роўнапраўныя грамадзяне нашай краіны соцыялізма. У часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР мы займаліся ў гуртках па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», для нас арганізоўваліся даклады, лекцыі, экскурсіі.

Я асабіста з вялікай радасцю наведвала гурток на выбарчым участку № 68 (Менск).

Я вельмі ўдзячна комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну, што нам, хатнім гаспадыням, была ўдзелена такая вялікая ўвага. Я лічу неабходным, каб гурткі хатніх гаспадынь і надалей працягвалі сваю работу і збіраліся хоць 2—3 разы ў месяц.

Пелагея Арцёмаўна АРЛОЎСКАЯ,
хатняя гаспадыня.

ВЯЛІКІ ПАВАРОТ У МАІМ ЖЫЦЦІ

Выбары ў Вярхоўны Совет зрабілі вялікі паварот у маім жыцці. Я ніколі не адчувала сябе такой шчаслівай, як зараз.

З пачаткам выбарчай кампаніі на нашым 63 выбарчым участку гор. Менска былі арганізаваны для хатніх гаспадынь гурткі па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» і Сталінскай Канстытуцыі. На кватэры да нас прышлі агітатары. Я стала актыўна наведваць гурток. Уключылася ў кіпучае жыццё краіны.

Мне на ўсё жыццё запомніўся дзень выбараў 12 снежня. У гэты дзень мы ўсе, як адзін, пайшлі на выбарчыя ўчасткі галасаваць за сваё роўнапраўнае, шчаслівае жыццё, за партыю большэвікоў, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Я са сваім мужам-пенсіянерам з гонарам аддалі свае галасы за лепшага саратніка вялікага Сталіна — дарагога Клімента Ефрэмавіча Варашылава і за тав. Ванеева. Галасуючы за іх, мы галасавалі за нашага любімага і роднага бацьку — таварыша Сталіна, які даў усім працоўным шчаслівае жыццё.

Я дзякую вялікаму Сталіну за роўнапраўнае, радаснае жыццё, дзякую за выдатную Канстытуцыю, па якой я паднялася на недасягальную вышыню чалавечага шчасця.

Соф'я Сідараўна ДЗЯНІСАВА,
хатняя гаспадыня.

БУДУ ПРАЦЯГВАЦЬ РАБОТУ З ГУРТКОМ

Партыйная арганізацыя завода «Большэвік» даручыла мне весці прапагандысцкую работу на 25 выбарчым участку горада Менска. Я працавала з гуртком хатніх гаспадынь дамоў №№ 105 і 109 па Фрунзеўскай вуліцы. Такой актыўнасці ў наведванні гуртка я яшчэ не бачыла ніколі.

У маім гуртку займалася непісьменная хатняя гаспадыня тав. Аўдзеева. Яна мне аднойчы сказала: «Хоць я і непісьменная, але ўжо настолькі добра азнаёмілася з нашым дэпутатам, што нават слова Варашылаў навучылася пісаць».

Хатнія гаспадыні і зараз пры сустрэчы са мной просяць заходзіць да іх, пачытаць газеты. Я лічу, што трэба замацаваць работу гурткоў хатніх гаспадынь. Цяга да ведаў у іх нястрымная, і ім трэба дапамагчы. Я асабіста з вялікай ахвотай буду працаваць з сваім гуртком і далей.

ЛІАКУМОВІЧ,
агітатар 25 выбарчага ўчастка, бібліятэкар скурзавода «Большэвік».

Я НАВУЧЫЎСЯ ПРАЦАВАЦЬ НАД САБОЙ

Комсамольскі камітэт электрастанцыі вылучыў мяне агітатарам гуртка па вывучэнню «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССР» і Сталінскай Канстытуцыі. Гурток складаўся з 20 рабочых-беспартыйных, якія жылі ў інтэрнаце.

Першыя заняткі прайшлі даволі слаба. Але-ж з гэтых заняткаў я зрабіў для сябе адпаведныя вынікі. Я зразумеў, што для таго, каб зрабіць свае лекцыі больш цікавымі і карыснымі, трэба падносіць слухачам не сухі матэрыял, а матэрыял, насычаны жывымі фактамі. Гэта яшчэ больш прымусіла мяне працаваць над сабой. Наступныя заняткі ўжо сталі больш цікавымі. Рабочыя з ахвотай наведвалі гурток.

Калі распрацоўка тэмы з рабочымі была закончана, мне даручылі правядзенне заняткаў з хатнімі гаспадынямі 38 выбарчага ўчастка. Гэта аўдыторыя значна адрознівалася ад першай па сваіх ведах. Маючы ўжо, аднак, пэўную практыку, хаця праўда і невялікую, я змог хутка прыстасавацца да сваіх новых слухачоў і зацікавіць іх.

Пачаў заняткі з даклада таварыша Сталіна на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў. Падрабязна спыніўся на зменах, якія адбыліся за апошнія гады ў нашай краіне, расказаў аб міжнародным становішчы. На ўсіх занятках хатнія гаспадыні з увагай слухалі мяне, задавалі пытанні.

Цікавасць да заняткаў усё больш узрастала. Некаторыя хатнія гаспадыні (Каханоўская, Абрамовіч), якія на першых занятках праяўлялі пасіўнасць, сталі паступова авалодваць матэрыялам і прымаць актыўны ўдзел у гутарках.

Работа агітатара была для мяне вялікай школай. Яна прымушала мяне больш глыбока прапрацоўваць матэрыял, прачытваць шмат літаратуры — журналаў, кніг, газет. Я навучыўся працаваць над сабой. Я рос разам са сваімі слухачамі. Зараз я магу весці і надалей гурток па бягучай палітыцы.

Работа агітатара дапамагла мне падрыхтавацца да ўступлення ў кандыдаты партыі.

Быць агітатарам — пачэсная і адказная справа. Я ганаруся тым, што мне выпаў гэты гонар.

ВАЛЬКОВІЧ К. Д.,
комсамолец, работнік электрастанцыі, агітатар 38 выбарчага ўчастка.

Плады польска-германскай „дружбы“

Бадай, яшчэ ніколі з часу ўстанаўлення польска-германскага саюза не праяўлялася такая адкрытая трывога з повазу плачэўных для Польшчы рэзультатаў гэтай «дружбы», як у апошні час. Асабліва вялікая трывога ў Польшчы за лёс Данцыга. Калісьці прускі кароль Фрыдрых II сказаў, што той, хто ўладае Данцыгам, уладае ўсёй Польшчай. Аб гэтым зараз з горыччу напамінае апазіцыйны польскі друк, указваючы, што палітыка міністра замежных спраў Бека пракладае шлях да канчатковага захопу Данцыга гітлераўскай Германіяй.

Быў час, калі гітлераўскі друк ідэалістычна маляваў перспектывы «дружбы» Германіі з Польшчай. Па заданню Гебельса ў Германіі з'явіліся нават кнігі, дзе ў самых светлых тонах маляваліся дзеячы кіруючага лагера Польшчы. Праўда, глыбокія супярэчнасці, існаваўшыя між Польшчай і Германіяй, не знімаліся. Германія ні ў якім разе не прымірылася з фактам «аўтаноміі» Данцыга і прыналежнасці да Польшчы тэрыторыі Верхняй Сілезіі, Пазнанскай і Прыморскай абласцей, якія калісьці належалі ёй. Але ідэалізацыя германа-польскага саюза ў першы перыяд «дружбы» патрэбна была Гітлеру для таго, каб стварыць падыходзячую палітычную атмасферу для прыцягнення Польшчы на службу імперыялістычным планам фашысцкай Германіі.

Вядома, што для дасягнення гэтай мэты Гітлеру не давялося прыбягаць да асаблівага майстэрства ў сваёй палітыцы ў дачыненні да польскага партнёра. Рашаючыя колы польскага манапалістычнага капітала і памешчыцкія магнаты на працягу ўсяго перыяду незалежнага існавання Польшчы ставілі сваёй мэтай збліжэнне з той з буйных еўрапейскіх дзяржаў, якая на даным адрэзку часу з'яўляецца галоўным падпальшчыкам вайны і з'яўляецца больш агрэсіўнай да Совецкага Саюза. Паколькі гэтая роля пасля гітлераўскага перавароту перайшла да Германіі, Польшча шпарка пайшла на збліжэнне з ёю. Замежная палітыка Польшчы робіцца палітыкай ваеннага блоку з Германіяй. Раз'язджаючы па краінах Еўропы, польскі міністр замежных спраў Бек безупынна рыхтуе глебу для агрэсараў.

Фашысцкая Германія неўзабаве, як вядома, знаходзіць саюзнікаў у асобе рэакцыйна-фашысцкіх урадаў іншых дзяржаў. З'яўляецца на міжнароднай арэне палітыка праслаўтай «асі» Берлін—Рым, а пазней — Берлін — Рым — Токіо, г. зн. згавор галоўных агрэсіўных дзяржаў супроць справы міру і незалежнасці іншых краін. У пошуках саюзнікаў для фашысцкай Германіі не мала папрацаваў і Бек. Гітлер-жа, выкарыстаўшы Польшчу для выхаду з ізаляцыі, у якой Германія апынулася ў першы час пасля фашысцкага перавароту, пачынае менш цырамоніцца з сваім польскім «саюзнікам».

Гітлераўская Германія яўным чынам выціснае Польшчу з Данцыга. Стаўленікі Гітлера авалодваюць адміністратыўным і палітычным апаратам Данцыга, нахабна топчучы канстытуцыю «вольнага» горада. На старонках гітлераўскага друку, замест кампліментаў па адрасу Польшчы, з'яўляюцца заметкі аб тым, што палякі ў Прыморскай і Пазнанскай абласцях адчуваюць сябе як «на чужой тэрыторыі». У заходніх вобласцях Польшчы ствараецца сетка патаемных гітлераўскіх арганізацый, якія займаюцца дыверсіяй, шпіянажам на карысць Германіі. Побач з гэтым узмацняюцца праследаванні польскай нацыянальнай меншасці ў Германіі.

Гэта «шчырая» і «прыязная» палітыка гітлераўскай Германіі ў дачыненні да свайго польскага саюзніка ў апошні час пайшла яшчэ далей. На старонках газеты «Дзеннік людовы» прама гаворыцца аб падрыхтаваннях данцыгскіх гітлераўцаў да канчатковага далучэння Данцыга да «Трэцяй імперыі». Ужо зараз у Данцыгу папулярызуюцца метады, шляхам якіх гэтае далучэнне будзе праводзіцца. У прыватнасці, указваюць на ўвядзенне ў Данцыгу нямецкай маркі, замест данцыгскага гульдэна. «Данцыгскія гаспадарчыя колы — піша карэспандэнт паменёнай газеты — плануюць, што ў выпадку пратэсту Польшчы супроць увядзення ў Данцыгу нямецкай валюты аперацыя гэта будзе ажыццёўлена шляхам фінансавання Германіяй у сваёй валюце шырокіх грамадскіх прац у Данцыгу. Такім шляхам данцыгскі рынак будзе наводнен нямецкай маркай, пасля чаго фармальнае зняцце з абароту гульдэна з'явіцца ўжо другарадным пытаннем».

Наступным крокам гітлераўцаў, як паведамляе гэтая-ж газета, з'явіцца замена сцяга вольнага горада на дзяржаўны сцяг Германіі і ўвядзенне ў Данцыгу, па прыкладу Германіі, закона аб абавязковай ваеннай службе.

Побач з планамі захопу Данцыга ў Берліне ствараюцца агрэсіўныя планы адарвання тэрыторыі самой Польшчы. На адбыўшымся нядаўна ў Берліне з'ездзе нямецкіх «гісторыкаў» данцыгскі «прафесар» Рэк, спыняючыся на аналізе польска-германскага дагавору, недвухсэнсна заявіў, што Германія, дзякуючы дагавору з Польшчай, «атрымала магчымасць з большай энергіяй прыступіць да правядзення кампаніі супроць Версальскага дагавору і рэстаўраваць сваю армію». І нібы намячаючы далейшыя перспектывы польска-германскай «дружбы», на з'ездзе адкрыта высоўвалі довады пра неабходнасць «германскай экспансіі на ўсход» — экспансіі, якая вядзе да захопу тэрыторыі Польшчы.

У сувязі з надаўнім візітам французскага міністра замежных спраў Дэльбоса ў Варшаву, некаторыя колы польскай буржуазіі імкнуліся стварыць думку аб тым, што ўрад, быццам, прадпрымае крокі для аднаўлення дружбы з Францыяй. У якой меры гэтыя спробы шчырыя, можна пераканацца на прыкладзе паездкі Рыдз-Сміглы ў Парыж у 1936 годзе. Тады нават французскія крэдыты не паслабілі актыўнай дзейнасці Бека па разрыву калектыўнай безапаснасці, якая з'яўляецца асновай знешняй палітыкі Францыі.

Германафільская арыентацыя Польшчы застаецца нязменнай. Як піша французская соцыялістычная газета «Попюлер», «польская палітыка значна больш вызначаецца пагадненнем з Германіяй у 1934 годзе, чым саюзным дагаворам 1931 года з Францыяй. Гэты факт трэба прызнаць...»

Не гледзячы на ўсё больш відавочную пагрозу інтарэсам Польшчы з боку фашысцкай Германіі, кіруючая кліка пілсудчыкаў працягвае весці палітыку падпарадкавання інтарэсаў Польшчы інтарэсам германскага імперыялізма. Ужо адно тое, што польскі ўрадавы друк роўнадушна сустракае ўсе гітлераўскія правакацыі, красамоўна сведчыць аб васальным становішчы Польшчы.

Гісторыя ў поўнай меры паўтараецца. У XVIII стагоддзі польская шляхта гандлявала бацькаўшчынай, падпарадкуючы інтарэсы польскай нацыі сваім класавым прывілеям. У цяперашняй Польшчы фашысцкая кліка, якая прарвалася да ўлады, у інтарэсах буйных капіталістаў і памешчыцкіх магнатаў ставіць на рызыку незалежнасць краіны. У канцы XVIII стагоддзя захоп Данцыга прускімі войскамі паслужыў прологам да падзелу Польшчы. Арганізоўваемы Гітлерам захоп Данцыга цяпер адкрывае шлях да паняволення Польшчы. Далучэнне Данцыга да Германіі ставіць пад пагрозу выхад Польшчы да мора, бо гітлераўскія гарматы з Данцыга ў любы момант могуць зруйнаваць польскі порт Гдыню.

Антынацыянальная палітыка ўрадавых колаў Польшчы, увасабляемая польскім міністрам замежных спраў Бекам, асуджана велізарнай большасцю народа. Польскі народ больш ста год пакутваў пад чужаземным панаваннем. У барацьбе з чужаземнымі прыгнятальнікамі ён нямала праліў крыві. Самыя выдатныя традыцыі польскага народа, гэта — барацьба за свабоду, за мір, за незалежнасць.

«...Традыцыі барацьбы за нацыянальнае вызваленне, — пісаў В. І. Ленін, — былі так моцны і глыбокі, што пасля паражэння на радзіме лепшыя сыны Польшчы ішлі падтрымліваць скрозь і ўсюды рэволюцыйныя класы; памяць Дамброўскага і Врублеўскага неразрыўна звязана з найвялікшым рухам пролетарыята ў XIX стагоддзі, з апошнім — і, будзем спадзявацца, апошнім няўдалым — паўстаннем парыжскіх рабочых...» (Збор тв. В. І. Леніна, т. V, стар. 340).

Жывым увасабленнем гэтых традыцый з'яўляецца шырокая барацьба працоўных мас, якая адбываецца зараз у Польшчы. У шматлікіх забастоўках пролетарыята, у мільённай забастоўцы сялян, у выступленнях настаўнікаў народныя масы заяўляюць, што яны супроць таго, каб Польшча была дадаткам да «асі» Берлін — Рым — Токіо, што яны стаяць за мір і свабоду, што для ўмацавання незалежнасці Польшчы неабходны саюз з дэмакратыяй.

Нават многія верныя прыхільнікі прыяцельскіх адносін Польшчы з фашысцкай Германіяй выходзяць з роўнавагі перад тварам апошніх гітлераўскіх выступленняў у Данцыгу.

Апазіцыйная фашысцкая партыя — нацыянал-дэмакраты — на працягу доўгага часу падтрымлівала прагітлераўскую палітыку кіруючага лагера. Але «кіслыя плады дружбы» — як выражаецца орган нацыянал-дэмакратаў ад 2 верасня — сталі настолькі відавочны, што яны таксама вымушаны біць трывогу.

«Калі Германія разглядае польска-германскі дагавор — пісаў орган эндэкаў — як кавалак паперы, з гэтага трэба зрабіць вывад». У рэзалюцыі, прынятай на мітынгу эндэкаў у Пазнані, яшчэ больш рэзка ўказваецца:

«Маючы на ўвазе, што за цяперашняе становішча ў Данцыгу непасрэдную адказнасць перад Польшчай нясе польскі міністр замежных спраў Бек, мы канстатуем, што ён не павінен аставацца на гэтым пасту, патрабуем рашучага супрацьдзеяння германскім імкненням на Балтыцы».

У Польшчы нядаўна адбылося зліццё каталіцкай партыі і «народнай партыі працы» ў аб'яднаную апазіцыйную партыю «Стронніцтво працы». За гэтымі партыямі ідуць значныя колы дробнай буржуазіі і польскай інтэлігенцыі, асабліва ў заходніх вобласцях Польшчы. Само заснаванне новай апазіцыйнай да ўрада партыі ў момант, калі робяцца безвыніковыя спробы кансалідаваць «Лагер нацыянальнага аб'яднання» (так называецца новая фашысцкая партыя, створаная Коцам), мае вялікае значэнне. Рэзкае незадаволенне палітыкай нацыянальнай здрады, якое расце ў масах польскага народа, выклікала і выступленне гэтай «Стронніцтво працы», партыі, якой чужы рэволюцыйныя тэндэнцыі, якая часам варожа да іх адносіцца, але якая тым не менш прымушана заявіць, што асновай яе дзейнасці з'яўляецца «барацьба за дэмакратыю і накіраванне замежнай палітыкі Польшчы ў старану дэмакратычных дзяржаў».

Як доўга гэта партыя будзе верна гэтым прынцыпам, пакажа бліжэйшае будучае. Але яе заснаванне і падобныя выступленні сведчаць, што рух народных мас за свабоду і мір супроць палітыкі нацыянальнай здрады вывеў дробную буржуазію са стану пасіўнасці, у якім яна знаходзілася да гэтай пары, і прымусіў яе напісаць на сваім сцягу два асноўныя патрабаванні мас: дэмакратыя і мір.

Гэта гаворыць аб тым, што фронт дэмакратыі і міру пашыраецца. Прабуджаюцца новыя слаі польскага народа. Збанкрутаваная кліка пілсудчыкаў разлічвае, што шляхам антысовецкага цкавання ёй удасца стрымаць гэтае прабуджэнне новых слаёў польскага народа, яго аб'яднанне ў радах народнага дэмакратычнага, антыфашысцкага фронта і накіраваць небяспечны для яе рух па іншаму руслу.

Але шырокія масы бачаць рэзультаты прагітлераўскай палітыкі фашысцкага ўрада і ўсё больш усведамляюць, што незалежнасці Польшчы пагражае толькі фашысцкая Германія.

Праўда аб СССР — магутным аплоце ўсеагульнага міру — глыбока жыве ва ўсведамленні польскага народа. І польскаму фашызму не развеяць яе, якія метады ён ні ўжываў-бы.

А. САКАЛОЎСКІ.

ЗРЫВАЮЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

Петрыкаўская МТС павінна адрамантаваць свой трактарны парк у колькасці 44 трактароў і апрача таго 25 трактароў Капаткевіцкай МТС. Аднак да рамонту трактароў тут нават не падрыхтаваліся. Рамонтная кампанія зрываецца.

Майстэрня машынна-трактарнай станцыі яшчэ не адрамантавана. У ёй няма патрэбнага абсталявання і запасных частак, не падшыта столь, халадна.

На рамонце павінна працаваць 30 чалавек. Ёсць-жа пакуль толькі 12. Умовы для работы рабочым не створаны. Яны вымушаны спаць на сталах, бо няма інтэрната. Дырэктар МТС Купейнікаў не забяспечыў рабочых сталовай, кватэрамі, дровамі. Стары рабочы Шульман, які жыве ў вельмі дрэннай кватэры, неаднаразова звяртаўся да Купейнікава за дапамогай. Але ён ніякіх мер не прымае, бяздушна адносіцца да запросаў рабочых.

Дырэктар МТС Купейнікаў свядома зрывае рамонт трактароў. Ён за апошні час зволіў з работы камсамольцаў Тарасевіча, Ландо, Капоніка, Ігнаценка і іншых.

Купейнікаў з'яўляецца стаўленікам ворагаў народа, з якімі ён меў цесную дружбу. Яшчэ будучы дырэктарам саўгаса «Дарашэвічы», ён дапусціў гаспадарку да вялікага прарыву. За той яго „работы" ў саўгасе пала 120 галоў маладняка.

Усё гэта выклікае неабходнасць праверыць палітычны твар Купейнікава.

ТРАКТАРЫСТЫ.

НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ ПАСТАНОВУ ПАРТЫІ

З дня апублікавання гістарычнай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання» прайшло больш чатырох месяцаў.

Не глядзячы на такі вялікі адрэзак часу, па Менскаму сельскаму раёну усё яшчэ не скончана ліквідацыя шкодніцка арганізаваных саўгасаў. З 10 саўгасаў, якія падлягаюць ліквідацыі, цалкам ліквідаваны толькі 2 саўгасы—імя Свердлова і «Негарэлае». Па астатніх 8 саўгасах яшчэ не рэалізаваны дзесяткі галоў жывёлы, вялікая колькасць насеннага і кармавога зерна штодзённа псуецца.

Бескантрольнасць з боку райвыканкома і райземаддзела і палітычная бяспечнасць Наркамсаўгасаў БССР прывялі да таго, што асобныя ўпаўнаважаныя па ліквідацыі саўгасаў злачынна разбазарваюць дзяржаўную маёмасць.

Па саўгасу «Вязань-Фаніпаль» былы дырэктар Любецкі (за рэчы, выключаны з партыі, як чалавек з цёмным мінулым) «рэалізаваў» 8 кабаноў вагою па 300 кілаграмаў кожны сярод асобных работнікаў Наркамсаўгасаў Беларусі. 5 гектараў добраякаснай саўгаснай капусты пакінуў зімаваць пад снегам. У саўгасе яшчэ і зараз не рэалізавана 94 галавы буйной рагатай жывёлы і 31 штука маладняка, якія знаходзяцца ў дрэнным становішчы. Застаўшыяся без нагляду 40 тон добраякаснага сартавога аўсу згноена.

Наўмысля зацягвае ліквідацыю саўгаса «Пролетарый» упаўнаважаны Наркамсаўгасаў БССР Ламановіч. Ён устанавіў заведама няправільныя, дутыя цэны на жывёлу. У рэзультаце калгасы адмаўляюцца ад пакупкі жывёлы па такіх цэнах. Такім чынам у саўгасе засталося нерэалізаванымі 25 коней. Ёсць многа трактарнага і кавальскага інвентара, запасных трактарных частак. Усё гэта заляецца дзе папала. Застаўшыяся 5 тон добраякаснай пшаніцы прыведзены ў нягоднасць з прычыны безгаспадарчасці. Кузню і лазню, якія павінны былі быць перададзены калгасам, Ламановіч незаконна разбурыў і выкарыстаў на дровы для асабістых патрэб.

Па саўгасу «Свабода» (упаўнаважаны Курловіч) яшчэ не перададзена ні дзяржаве, ні іншым саўгасам 80 тон аўсу гатунку «Залаты», які з-за безадказнасці кіраўніцтва саўгаса вельмі вільготны і заражон кляшчом. У саўгасе яшчэ засталіся 44 каровы, трактар, малатарка і дробны сельскагаспадарчы інвентар.

Асобныя калгасы і саўгасы яшчэ не вывезлі з ліквідуемых саўгасаў закупленую маёмасць, як напрыклад: калгас «Пролетарый», Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета, «Пабеда», Папярнянскага сельсовета, «Ударнік», Калодзішчанскага сельсовета, саўгасы «Спартак» і «Горкі-Абчак».

Дзіўную пазіцыю займае Наркамсаўгасаў БССР, які дапускае злачыннае зацягванне ліквідацыі шкодніцка арганізаваных саўгасаў. Загадчык менскага райза тав. Кляўко самаўхіліўся ад работы па ліквідацыі шкодніцка арганізаваных саўгасаў.

С. ГРЫШЧАНКА.

БУДАЎНІЦТВА Ў КАЛГАСАХ

У калгасах БССР з кожным годам усё больш разгортваецца будаўніцтва новых культурна-бытавых устаноў і дапаможных прадпрыемстваў. У гэтым годзе ў калгасах пабудавана 158 клубаў, 239 лазняў і 82 дзіцячых ясляў. Былі пушчаны ў эксплаатацыю ўноў пабудаваныя 78 цагельных, 8 чарапічных і 10 вапняных заводаў. Гэтыя дапаможныя прадпрыемствы далі 10 мільёнаў штук цэглы і каля 900 тон вапны. У дадзены момант будуюцца 71 цагельны, 35 чарапічных і 4 вапнявых заводы.

Дапаможныя прадпрыемствы павялічылі даходнасць калгасаў і калгаснікаў. Калгас імя Молатава, Даманавіцкага раёна, пабудаваўшы ў гэтым годзе цагельны завод, атрымаў прыбытку 12.000 рублёў. Апрача таго, ён пабудаваў калгасныя яслі і арганізаваў рамонт печаў у дамах калгаснікаў.

У сувязі з багатым ураджаем гэтага года будаўніцтва ў калгасах набывае вялікі размах. Па няпоўных даных, калгасы БССР у 1938 годзе намецілі затраціць сваіх уласных сродкаў на будаўніцтва культурна-бытавых устаноў і дапаможных прадпрыемстваў, не лічачы гаспадарчых пабудоў, звыш 7 мільёнаў рублёў.

АДНААСОБНІКІ ЎСТУПАЮЦЬ У КАЛГАСЫ

Вялікае ўсенароднае свята—дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР—працоўныя аднаасобнікі Перахаўскага раёна адзначылі ўступленнем у калгасы.

У калгас «4-ты завяршаючы», Краўпоўскага сельсовета, улілося 15 аднаасобных гаспадарак.

Былыя аднаасобнікі Сіманчук Іван, Сіманчук Лука, Дабудзелава Лёкся, Спешанок Павел і інш. вялікі гістарычны дзень, 12 снежня, адсвяткавалі ў калгасе.

С. ГОРДЗІНА.

НОВЫЯ КІНОТЭАТРЫ Ў БССР

Белдзяржпраект закончыў складанне эскізных праектаў пабудовы новых гукавых кінотэатраў: у Менску — на 1.200 месц, у Гомелі — на 900 месц, у Бабруйску — на 700 месц і ў Лепелі — на 500 месц.

Значную цікавасць прадстаўляе эскізны праект кінотэатра ў Менску — работы беларускіх архітэктараў Вараксіна і Столяра. У гэтым тэатры, апрача глядзельнай залы, будуць гардэробныя для ўсіх наведвальнікаў, файе, рэстаран, гасціная, адкрытая канцэртная зала, выставачныя памяшканні. Намячаецца ўнутранае афармленне яго штучным мрамарам, каштоўнымі пародамі дрэва, люстрамі, лепкай, скульптурай. Агульная кубатура будынка — 30.000 куб. метраў. Кінотэатр будзе будавацца ў раёне праектуемай новай плошчы Советаў паміж вуліцамі Фрунзенскай і Правіянцкай.

У Гомелі запраектавана пабудова кінотэатра з 2 глядзельнымі заламі — па 450 месц кожная, з фае і вестыбюлем па тыпу новых маскоўскіх кінотэатраў.

Новы бліскучы рэкорд тав. Гудава. 7 снежня знатны стаханавец станказавода імя С. Орджанікідзе, дэпутат Совета Саюза ад Ленінскай выбарчай акругі гор. Масквы, ордэнаносец тав. І. І. Гудаў паставіў новы выдатны рэкорд. Працуючы на фрэзероўцы кулачка для зажыму патрона на фрэзерным станку, тав. Гудаў за змену выканаў 4.582 проц. нормы. К канцу змены на завод прыехаў сакратар Маскоўскага камітэта партыі тав. Н. С. Хрушчоў, які віншаваў тав. Гудава з бліскучай перамогай. НА ЗДЫМКУ: тав. І. І. Гудаў ля станка пасля скончэння змены.

Фото Б. Фішмана. (СФ).

ДРУГАЯ СТАХАНАЎСКАЯ ДЭКАДА НА МАГІЛЕЎСКІМ АЎТАРЭМЗАВОДЗЕ

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). Вялікіх вытворчых дасягненняў дабіліся рабочыя прадпрыемстваў горада Магілева ў дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў.

Дзень выбараў у Вярхоўны Совет і перамога на гэтых выбарах блока камуністаў з беспартыйнымі выклікалі новы вытворчы ўздым. Рабочыя гараць жаданнем не толькі замацаваць дасягнутыя поспехі ў дні сталінскай дэкады, але дабіцца новых і новых перамог, каб дастойна сустрэць новы гаспадарчы 1938 год.

Рабочыя трубаліцейнага завода на сваім мітынгу абавязаліся да канца года выпрацаваць звыш плана 700 тон гатовай прадукцыі.

Калектыў рабочых піваварнага завода «Пролетарый» выканаў свой гадавы план на 100,85 проц. і абавязаўся да канца года даць дадаткова прадукцыі на 180 тысяч рублёў.

На аўтарэмзаводзе ў дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў значна ўзнялася прадукцыйнасць працы. Завод, які меў вялікія вытворчыя прарывы, значна палепшыў сваю работу.

Добрыя паказальнікі работы дае цэх № 1 (начальнік тав. Рытнікаў). Цэх выканаў свой гадавы план да дня Канстытуцыі на 200 проц. За дні сталінскай дэкады выкананне раўняецца 106,4 проц. Лепшая брыгада расточнікаў—майстра тав. Біцяева за дэкаду выканала план на 259,7 проц. У гэтым цэху стаханавец Сідлер у асобныя дні дэкады даваў 700 проц. выканання задання. У сярэднім за дэкаду ён выконваў заданне на 460 проц. Стаханаўцы тт. Осіпаў, Магер, Грышч, Сапрыка ў сярэднім выконвалі нормы на 300 проц.

Стаханавец-аўтаслесар тав. Міхальчанка (цэх № 2) у часе сталінскай дэкады выконваў заданне на 315 проц. Зараз, пасля выбараў у Вярхоўны Совет СССР, ён выконвае норму на 480 проц. Стаханавец-слесар тав. Батвінік за дэкаду даваў 345 проц., а 15 снежня выканаў норму на 359 проц.

Зборшчык платформ стаханавец тав. Захаранка (цэх № 4) у дні сталінскай дэкады выконваў норму на 500 проц. Дасягнутыя поспехі ён не зніжае.

Рабочыя аўтарэмзавода зараз уключыліся ў другую сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў і рыхтуюцца да стаханаўскага месячніка.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

У гонар дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР 11 снежня менскі завод ланцугоў Галя выканаў сваю вытворчую гадавую праграму на 100,2 проц. Рабочы калектыў узяў на сябе абавязацельства да новага 1938 года выпусціць прадукцыі звыш плана на суму 300 тыс. рублёў. Свае слова рабочыя і работніцы з гонарам стрымліваюць. Кожны дзень прадпрыемства свой вытворчы план выконвае не менш як на 100 проц. Рад стаханаўцаў дабіліся новых вытворчых поспехаў.

У штамповачным цэху 16 снежня стаханавец тав. Крэнь даў 255 проц. нормы, тав. Бранкевіч — 268 проц., тав. Швед— 300 проц., тав. Шабан — 307 проц., а тав. Масюкевіч — 318 проц. нормы. Рэвальвершчыца тав. Купрыяновіч, якая працуе на складаным працэсе, норму выканала на 200 проц. замест ранейшых 135—140 проц.

У слясарна-зборачным цэху новы вытворчы рэкорд устанавіў слесар тав. Далейка, які даў 338 проц. нормы. У тэрмічным цэху наперадзе ідуць стаханаўцы тт. Радэцкі і Апорын. Першы норму выконвае на 296 проц., другі — на 301 проц.

М. А.

СПРАВЫ ГАРАДОЦКІХ КІРАЎНІКОЎ

Гарадоцкі раён доўгі час быў аб'ектам шкодніцкіх спраў ворагаў, якія накіроўвалі сваю контррэвалюцыйную дзейнасць на знішчэнне жывёлы і, у першую чаргу, конскага пагалоўя. З мэтай выклікаць незадаволенне працоўнага сялянства, ворагі груба парушалі рэвалюцыйную законнасць, адбіралі ў калгаснікаў прысядзібныя ўчасткі, даводзілі да аднаасобнікаў непасільныя планы, праводзілі незаконнае забранне маёмасці, учынялі масавае штрафаванне.

Уся гэта шкодніцка-падрыўная дзейнасць праводзілася ворагамі, якія арудавалі, будучы на адказных пасадах у райвыканкоме, райза і райфа. Частка людзей з гэтай банды шкоднікаў выкрыта, але партыйная арганізацыя далёка яшчэ не ўсё зрабіла, каб да канца выкарчаваць варожае ахвосце, якое працягвае сваю падрыўную дзейнасць.

Да гэтага часу ў раёне яшчэ не скончана работа па звароту калгаснікам незаконна адрэзаных у іх прысядзібных участкаў. Больш таго, ёсць факты, калі і зараз у калгаснікаў незаконна адразаюць прысядзібную зямлю. Так, у калгасніцы сельгасарцелі «X з'езд ВЛКСМ», Болецкага сельсовета, Горавай Алены адрэзалі малады сад плошчай 0,45 га, у той час, калі ёй, згодна статута сельскагаспадарчай арцелі, павінны былі прырэзаць зямлю.

Злачынна марудна вяртаецца грамадзянам незаконна забраная маёмасць. Гэтую работу да апошніх дзён узначальваў былы старшы раённы падатковы інспектар, які аказаўся ворагам. Ён даваў свае «заключэнні» на зварот незаконна забранай маёмасці ў грамадзян, а райвыканком штампаваў гэта. У рэзультаце — многім грамадзянам маёмасць не вернута. Так, гр-ну Волкаву Ільі, з Кабішчанскага сельсовета, не вернута незаконна забраная ў яго карова. Не выплачана 300 рублёў грошай гр-ну Міхалёнку Спірыду, з Пальмінскага сельсовета, за беспадстаўнае забранне ў яго быка. Зуевай Пелагеі, з Болецкага сельсовета, не вернута 100 рублёў за забраны ў яе хлеў. Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

У раёне ганебна зрываецца план ільназагатовак. Ёсць факты, калі ільнатраста проста спальваецца, або ўжываецца для пакрывання дахаў (Болецкі сельсовет). Вялікая колькасць трасты асталася ляжаць пад снегам.

Адна з прычын гэтага крыецца ў кіраўніцтве райвыканкома. Старшынёй РВК з'яўляецца Генін, які працуе ў раёне многа год. Яшчэ будучы старшынёй райсаюза, ён узяў пад сваю апеку трацкіста Васілеўскага, які растраціў 46.000 рублёў дзяржаўных грошай. З гэтым аферыстам Генін быў звязаны яшчэ ў Лёзнянскім раёне.

Два апошнія годы Генін беззменна працаваў на адказнай рабоце ў райкоме партыі — спачатку загадчыкам сельгасаддзела, потым другім і першым сакратаром. Усе шкодніцкія, контррэвалюцыйныя справы, што рабіліся ў раёне, праходзілі на яго вачах і фактычна ім узначальваліся.

Генін меў вялікую колькасць сігналаў ад камуністаў і беспартыйных пра наяўнасць шкодніцкіх спраў у раёне, але ніколі не прыслухоўваўся і не жадаў прыслухоўвацца да голасу мас. Адміністраванне замест масавай работы, дача вымоў па тэлефону, грубы заціск крытыкі і самакрытыкі — такі стыль работы Геніна. Аб гэтым не раз гаварылася на раённых партсходах.

Працуючы старшынёй райвыканкома, Генін па сутнасці нічога не змяніў у стылі сваёй работы. Ён не толькі не жадае ліквідаваць вынікі шкодніцтва, але, па сутнасці справы, прадаўжае шкодзіць.

Тое-ж самае можна сказаць і аб райпракурору Этэвічу. Замест таго, каб стаяць на варце рэвалюцыйнай законнасці, ён сваёй бяздзейнасцю спрыяе праводзімай шкоднікамі контррэвалюцыйнай рабоце ў раёне. Многа спраў шкодніцкага характару ім проста спынена, значная колькасць іх марынуецца месяцамі ў кабінеце. Гэты гора-пракурор «не бачыў» усёй контррэвалюцыйнай дзейнасці ворагаў народа, якія арудавалі ў райвыканкоме, райза, райфа і ў асобных сельсоветах.

Райпартарганізацыя павінна сказаць сваё важкае слова аб шкодніцкай дзейнасці гэтых і падобных ім людзей.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ,
Д. ЕРМАКОВІЧ.

ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ Ў ШКОЛАХ

Весела і радасна правядзе свае зімовыя канікулы дзетвара сталіцы БССР. У азнаменаванне сканчэння вучобы першага паўгоддзя і сустрэчы новага 1938 года для школьнікаў і піянераў у школах і шэфствуючых прадпрыемствах будуць зроблены маляўніча аформленыя навагоднія ёлкі. Для вучняў восьмых, дзевятых і дзесятых класаў — спецыяльныя вечары, прысвечаныя сканчэнню першага паўгоддзя. Арганізаваныя фарпосты пры школах, дамавых упраўленнях будуць абслугоўваць дзяцей. На гэтых дварах зальюцца каткі, будуць зроблены снежныя горкі, куткі для правядзення гульняў, чытак і т. д.

Многія школьнікі-выдатнікі паедуць у дамы адпачынку, на экскурсіі. Так, 190 выдатнікаў вучобы будуць у часе канікул адпачываць 12 дзён у доме адпачынку «Ждановічы». 40 выдатнікаў вучобы паедуць на экскурсію ў горад Ленінград і 5 — на ўсесаюзны шашачны турнір у горад Ленінград.

У часе зімовых канікул спецыяльна для школьнікаў будуць наладжаны ва ўсіх тэатрах 9 пастановак, дзённыя кінасеансы і канцэрты.

Вялікая работа па абслугоўванню школьнікаў—піянераў і акцябрат будзе праведзена ў Палацы піянераў і акцябрат, дзе будуць наладжаны спецыяльныя гульні і забавы ля ёлак. Тут дзеці сустрэнуцца ля навагодняй ёлкі з пісьменнікамі, кампазітарамі, артыстамі і байцамі Чырвонай Арміі. Сіламі артыстаў для дзяцей будуць наладжаны канцэрты. Школьнікі і піянеры выступяць з паказам самадзейнасці. 10 студзеня для 9-х і 10-х класаў у Палацы піянераў і акцябрат будзе арганізаван вялікі касцюміраваны бал.

У басейне Дома Чырвонай Арміі 1 студзеня адбудуцца паказальныя заплывы 18 удзельнікаў-школьнікаў, якія выедуць у Маскву на ўсесаюзныя спаборніцтвы па плаванню.

У часе зімовых канікул са школьнікамі будзе праведзен цэлы рад масавых фізкультурных мерапрыемстваў, спаборніцтваў па каньках, лыжах, хакею, шахматах і інш., а таксама масавая вучоба і здача норм на значок «БГПА».

У Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Бабруйску, Оршы і іншых гарадах і раёнах будуць арганізаваны для школьнікаў ад 6-х да 10-х класаў масавыя карнавалы на катках.

Паміж школьнікамі сталіцы БССР 3 студзеня будуць праведзены гарадскія спаборніцтвы па валейболу. З 4 па 8 студзеня на стадыёне «Дынама» — гарадскія спаборніцтвы па хакею, 5 студзеня—па каньках, а 8 студзеня адбудзецца масавая лыжная вылазка за горад.

Зімовыя канікулы школьнікаў сталіцы БССР скончацца святам на стадыёне «Дынама», дзе будзе наладжан вялікі карнавал — ёлка на ільду.

І. МІН.

АЧЫСЦІЦЬ БЯЛЫНІЦКІ РАЁН АД ВОРАГАЎ

На працягу апошніх год у Бялыніцкім раёне праводзілася яўна варожая практыка, ставіўшая мэтай выклікаць незадаволенне сярод насельніцтва. У раёне мелі месца збіенні насельніцтва, пагалоўныя вобыскі ў аднаасобнікаў, незаконнае із'яцце маёмасці аж да рэчаў хатняга ўжытку, разборка гаспадарчых пабудоў і нават хат, няправільнае абкладанне падаткамі і інш.

У рэзультаце такой варожай палітыкі больш 70 проц. усіх аднаасобных гаспадарак было падвергнута розным рэпрэсіям. Многія з гэтых гаспадарак зусім зруйнаваны.

На ўсе шматлікія скаргі аб няправільных із'яццях і бясчынствах у райвыканкоме заўсёды даваўся стандартны адказ: «Із'яцце зроблена правільна». Там з сялянамі не хацелі гаварыць. Скаргі не разглядаліся і напаўнялі папкі аддзелаў РВК. Райвыканком і яго старшыня Чарткоў былі незаступны. Наўрад ці хто з жалабшчыкаў быў прыняты асабіста Чартковым. Для яго не было цяжкім выкінуць жалабшчыка з кабінета.

Дастаткова прывесці некалькі фактаў грубага парушэння рэвалюцыйнай законнасці, каб мець уяўленне аб усіх шкодніцкіх справах, якія тварыліся ў раёне.

У вёсцы Ігліцы, Запольскага сельсовета, у грамадзянкі Сідаровіч Матруны незаконна была забрана апошняя карова, калёсы, пяць аўчын, 60 пудоў бульбы.

У вёсцы Вылава, Ланькаўскага сельсовета, у сям'і чырвонаармейца Сквародкіна Антона незаконна забралі каня, свінню, раскідалі гумно і сарай.

На грамадзяніна Кандрацева Харытона было налічана 1.972 рублі падатку за заход ад гандлю, у той час, калі гэта гаспадарка ніякіх гандлёвых даходаў не мела.

У вёсцы Забалоцце ў аднаасобнікаў былі разабраны ўсе гаспадарчыя пабудовы, а ў грамадзяніна Віннікава ў вёсцы Машчаніцах разабралі нават і хату. Па Каліноўскаму сельсовету ў вёсках Мазкі і Забавы было знішчана на дровы для хлебапякарні многа каштоўных гаспадарчых пабудоў.

Ва Угальшчынскім сельсовеце старшыня Лабейка разам з сакратаром Хрушчовым і членам сельсовета Шарачковым із'ялі карову і, аформіўшы продаж за 100 рублёў, зарэзалі і яе мяса размеркавалі паміж сабой.

У в. Цехціна, Каліноўскага сельсовета, толькі за адзін дзень было забрана 9 кароў, якія прадаваліся за бясцэнак. У гэтым-жа сельсовеце былі сагнаны з пашы 40 авечак, якія належалі аднаасобнікам пасёлка Мазкі, і прадаваліся без усякага акта і афармлення.

Такіх агідных спраў у Бялыніцкім раёне многа, аб гэтым былі неаднаразовыя сігналы, скаргі, але ў раёне гэта нікога не турбавала. Усе сігналы аб парушэннях рэвалюцыйнай законнасці глушыліся як сакратаром райкома КП(б)Б Рымшай, так і старшынёй райвыканкома Чартковым. І гэта зусім зразумела, бо яны па сутнасці з'яўляліся ініцыятарамі ўсіх гэтых агіднасцей. Яны не адзін раз сумесна з загадчыкам райфа Кісленка выклікалі да сябе нават у начны час раённых і сельскіх работнікаў і патрабавалі больш «націскаць», ні перад чым не спыняцца пры із'яццях. Яны пасылалі на вёску спецыяльныя брыгады з раёна для ўдзелу ў масавых із'яццях. Старшыня райвыканкома Чарткоў дайшоў нават да таго, што заявіў старшыні Эсманскага сельсовета Яцкевічу:—Курэй развалося ў калгаснікаў і аднаасобнікаў, што па вуліцы нельга праехаць, а ў цябе плацяжы не спагнаны. Чаму не лозіш курэй!

Злачынныя метады работы, праводзімыя Чартковым у Талачынскім раёне разам з выкрытымі ворагамі народа, поўнасцю перанесены ім і ў Бялыніцкі раён. Парушэнне рэвалюцыйнай законнасці, варожае дзеянне ў адносінах да аднаасобнікаў і тут з'яўляліся метадам яго работы.

На асобныя факты шкодніцтва і злоўжывання ў калгасах у раёне не рэагавалі. Яшчэ ў красавіку былі сігналы аб шкодніцтве ў калгасе «Перамога». Там на млыне прымешвалі ў размол апілкі і гэтым кармілі жывёлу, ад чаго за вясну 1937 года ў калгасе пала 12 коней, 10 кароў, 18 свіней. Але віноўныя ў шкодніцтве асталіся непакаранымі.

У калгасе «Пролетарская перамога» сістэматычна раскрадвалася калгаснае збожжа, фураж. Многа хадзілі калгаснікі ў раён са скаргамі аб замене кіраўніцтва і прыцягнення да адказнасці віноўных у шкодніцтве. Але ў раёне замест умацавання калгаса абмежаваліся пасылкай туды на пасаду старшыні Старалаўнікава, якога ўжо два разы судзілі за збіенне калгаснікаў. Ён у калгасе вядзе развальваючую работу, арганізоўвае п'янкі.

Кіруючы склад раённых работнікаў засмечан класава-варожымі элементамі і рознымі прахадзімцамі. На працягу некалькіх год у раён падбіраліся кадры людзей, якія не выклікаюць ніякага палітычнага давер'я. Але з гэтым у раёне мірыліся, і варожыя людзі старанна захоўваліся на кіруючых пасадах. Ворагі народа мелі там спрыяючую глебу для шкодніцкай дзейнасці.

У якасці загадчыка райза доўгі час працаваў Саннікаў. Ён нямала натварыў перагібаў, пакідаючы без зямлі і сенакоса аднаасобнікаў. І калі яго нізавая партарганізацыя пачала выкрываць, то сакратар райкома Рымша, каб захаваць свае варожыя кадры, праз ворагаў народа, якія арудавалі ў апараце Наркамзема Беларусі, арганізуе перавод Саннікава ў другі раён. Такім чынам, Саннікаў і быў перакінут з Бялынічаў у Сіроцінскі раён непакараным.

У свой час, будучы старшынёй калгаса «Дзесяцігоддзе», Навасельскага сельсовета, Каган выступаў там з антысавецкай агітацыяй і сваёй дрэннай работай давёў калгас да развалу. Ён не адзін раз прымаў удзел у незаконных із'яццях. Два разы нізавая партыйная арганізацыя выключала яго з партыі, але сакратар райкома Рымша браў яго пад сваю абарону, аднаўляў у партыі і нават прызначыў на адказную работу ў райвыканком — райунутгандлем.

Намеснікам старшыні РВК да апошняга часу працаваў Ігнатовіч. Сам ён паходзіць з заможнай сям'і. Усе яго браты і сваякі — аднаасобнікі, карыстаючыся патураннем Ігнатовіча, сістэматычна злосна не выконвалі дзяржаўных абавязацельстваў. Але гэта не перашкаджае вылучыць яго на адказную савецкую работу.

Намеснік дырэктара МТС Залога не выклікае ніякага палітычнага давер'я. Працуючы ў МТС, ён праводзіў яўна шкодніцкую работу. Па яго віне ў гэтым годзе быў правален рамонт трактароў, які ў гарачы час прастайваў.

Жонка былога адказнага сакратара РВК аказалася ворагам народа. Аб гэтым паступала шмат сур'ёзных сігналаў у партыйную арганізацыю. Але на іх там не рэагавалі.

Інструктарам РК КП(б)Б працуе Чарняк Барыс. Чарняк не адзін раз прымаў удзел у масавых із'яццях маёмасці. На яго вачах праводзілася грубае парушэнне рэвалюцыйнай законнасці, як у Машчаніцкім і іншых сельсоветах. Інструктар райкома Янушкевіч у сваёй практычнай рабоце замазваў злоўжыванні, якія мелі месца ў калгасе «Другая пяцігодка», куды ён выязджаў па сігналах друку.

Вось далёка няпоўны пералік кіруючых работнікаў раёна, якія ні ў якой меры не павінны быць на адказных участках работы.

Не лепшы малюнак з кіруючымі работнікамі сельсоветаў і калгасаў. Людзі, раней судзімыя, знятыя ў адным сельсовеце за збіенне і розныя злачынствы, пасылаюцца зноў на работу ў іншыя месцы, дзе яны па-ранейшаму працягваюць арудаваць. Для прыкладу ўзяць хоць-бы наступны факт. Старшынёй Кулакоўскага сельсовета працуе Макаеў. Ён за збіенне сялян у Галаўчынскім сельсовеце ў свой час быў асуджан і выключан з партыі. Але, не глядзячы на гэта, яго ў раёне ўзялі пад абарону, аднавілі ў партыі і паслалі старшынёй у Кулакоўскі сельсовет, дзе ён ужо збіў члена сельсовета вёскі Стараселле Бурага Осіпа.

Старшынёй Запольскага сельсовета працуе Французаў, былы дэзерцір Чырвонай Арміі. Ён у сваім сельсовеце даручыў прапагандаваць выбарчы закон... трацкісту. Былы старшыня Рафалоўскага сельсовета Ткачоў незаконна арыштоўваў грамадзян. Былі выпадкі збіенняў, але гэта не перашкодзіла прызначыць яго старшынёй райсовета АСО.

Такіх прыкладаў можна прывесці значна больш.

Некалькі слоў аб самім кіраўніцтве. Сакратаром райкома КП(б)Б з 1933 года працуе Рымша. Усе гэтыя годы ў Бялыніцкім раёне груба парушалася рэвалюцыйная законнасць. Ён добра ведаў аб масавых незаконных із'яццях, збіеннях і сам патураў гэтым злачынствам. Ён гадамі мірыўся з тым, што ў раёне беспакарана арудвалі ворагі, жулікі, п'яніцы. Сам Рымша быў звязан з ворагам народа — папоўскім сынам, былым дырэктарам Запольскай школы. Не глядзячы на сігналы аб шкодніцкай рабоце гэтага ворага, Рымша браў яго пад сваю абарону і лічыў добрым работнікам. Рымша стварыў у раёне атмасферу затхлай сямейнасці, кругавой парукі, заціску самакрытыкі. Гэта ўсё стварыла спрыяючую глебу для работы ворагаў.

Старшыня райвыканкома Чарткоў у мінулым у 1929 і 1932 годзе быў судзімы і нават некаторы час знаходзіўся пад вартай. За час работы ў Бялынічах незаконна прысвойваў сабе дзяржаўныя грошы. У свой апарат ён падбіраў розных ворагаў і прахадзімцаў, якія тэрарызавалі насельніцтва. Чарткоў асабіста даваў указанні аб масавых із'яццях маёмасці, не выключаючы рэчаў хатняга ўжытку і нават курэй. Не без яго ведама раскідаліся ў аднаасобнікаў хаты і апошнія гаспадарчыя пабудовы.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што Бялыніцкі раён неабходна хутчэй ачысціць ад ворагаў народа і іх прыхвасняў.

С. ЛЯСНЕЎСКІ.

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ РЭЗУЛЬТАТАХ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 16 снежня. (БЕЛТА). Спецыяльны маскоўскі карэспандэнт газеты «Таймс» і карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» паведамляюць аб дэманстрацыі ў Маскве на Краснай плошчы ў гонар выбараў Вярхоўнага Совета СССР. Карэспандэнт «Таймс» называе гэту дэманстрацыю «адной з найбольш выдатных дэманстрацый, калі-небудзь меўшых месца на Краснай плошчы». На словах карэспандэнта, такую «магутную дэманстрацыю можна ўбачыць толькі ў Маскве». Карэспандэнт адзначае, што, не гледзячы на халоднае надвор'е, у дэманстрацыі прымала ўдзел звыш аднаго мільёна чалавек. Карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» называе дэманстрацыю «выдатным відовішчам».

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 16 снежня. (БЕЛТА). Французскі друк працягвае друкаваць водгукі на вынікі выбараў у Вярхоўны Совет.

Марсель Кашэн у «Юманітэ» піша, што выбары ў Вярхоўны Совет СССР паказалі цяснейшую згуртаванасць народаў соцыялістычных рэспублік вакол кіраўнікоў рабоча-сялянскага ўрада.—12 снежня, — указвае ён, — быў святочным днём для ўсіх народаў Саюза, і працоўныя ўсяго свету з радасцю вітаюць новы бліскучы поспех совецкай палітыкі. Кашэн спыняецца на міжнародным значэнні выбараў у Вярхоўны Совет СССР. «У дадны момант, калі міжнародная абстаноўка такая трывожная, — піша Кашэн, — вялікая краіна міру, — друг Францыі, дэманструе велічнае відовішча свайго маральнага і палітычнага адзінства... Кожны павінен зразумець, што ваенная сіла і глыбокае адзінства Совецкага Саюза перад тварам пагрозы вайны і нападу з боку фашысцкіх дзяржаў з'яўляюцца найбольш каштоўнай гарантыяй міру».

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 16 снежня. (БЕЛТА). Усе японскія газеты публікуюць паведамленне Цэнтральнай выбарчай камісіі аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Як паведамляе карэспандэнт агенцтва Домей Цусін з Масквы, усе рэспублікі паказалі бліскучыя рэзультаты ўдзелу выбаршчыкаў у выбарах. Гэта ўказвае на вялікае давер'е народаў СССР да свайго ўрада і да сваіх правадыроў.

Газета «Іоміуры» падкрэслівае, што ў Вярхоўны Совет СССР выбрана многа жанчын. Газета «Джапан адвертайзер» піша, што ў Вярхоўны Совет выбрана 288 беспартыйных.

РУМЫНІЯ

БУХАРЭСТ, 16 снежня. (БЕЛТА). Увесь румынскі друк публікуе паведамленне аб рэзультатах выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Газета «Лумеа Раманеаска» падкрэслівае выключна высокі процант выбаршчыкаў, прымаўшых удзел у выбарах. «Гэта даказвае,—піша газета,—што насельніцтва Совецкага Саюза, усведамляючы велізарнае значэнне прадастаўленага яму Сталінскай Канстытуцыяй выбарчага права, шырока выкарыстала гэта права. Ніколі і нідзе яшчэ не было такога вялікага ліку ўдзельнікаў выбараў». Газета адзначае, што «цяперашнія выбары, праведзеныя на аснове Сталінскай Канстытуцыі, з'яўляюцца яркім паказальнікам поспехаў у справе пабудовы бескласавага грамадства».

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ У КІТАІ. Разведачны атрад кітайскай арміі паведамляе проціпаветранай батарэі аб месцазнаходжанні заўважанага ім японскага самалёта. (СФ).

НОВЫЯ ВЫКРЫЦЦІ ФАШЫСЦКАЙ ЗМОВЫ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 16 снежня. (БЕЛТА). Учора палітычнай паліцыяй зроблены два новыя арышты.

Адзін з арыштаваных — уладальнік гаража на бульвары Пікпюс, запасны афіцэр авіяцыі Жаніо. Пад гаражом выкрыт бетаніраваны патаемны склад зброі. Знойдзена 6 кулямётаў «Гочкіс», 62 аўтаматычныя вінтоўкі германскай і італьянскай вытворчасці, 110 вінтовак, 896 гранат і некалькі сот кілаграмаў патронаў. Усяго забрана каля 7 тон ваеннага снаражэння і зброі.

Учора вечарам у палацы дэпутатаў міністр унутраных спраў Дормуа прызнаў усю сур'ёзнасць рэзультатаў вобыску на бульвары Пікпюс. На словах міністра, значная частка знойдзенага ўзбраення дастаўлена з г. Таледо, які знаходзіцца ў руках фашысцкіх мяцежнікаў.

**

ПАРЫЖ, 16 снежня. (БЕЛТА). Палітычнай паліцыяй, якая вядзе расследванне па справе аб фашысцкай змове ва Францыі, выяўлен у Парыжы на бульвары дэ Курсель новы буйны тайны склад зброі. У склепе, належачым нейкаму банкаўскаму служачаму, знойдзена 5 скрынь з мелінітам (моцная выбуховая матэрыя) па 30 кілограм у кожнай і 20 скрынь з гранатамі па 32 гранаты ў кожнай скрыні; апрача таго знойдзены аўтаматычныя вінтоўкі і многа патронаў.

Газета «Се суар» прыводзіць новыя даныя аб вядомым агенце гітлераўскага Гестапо — бароне фон Потэрсе, які быў замешаным у выкрытай ва Францыі фашысцкай змове і надаўна ўцёкшым за граніцу. Па вестках газеты, фон Потэрс меў агентаў амаль ва ўсіх кутках свету, дзейнічаўшых па заданнях гітлераўскага шпіёнскага цэнтра. Карэспандэнт прыводзіць знойдзены ў Берне пры вобыску ў нейкага Тэтлі спіс агентаў фон Потэрса. У гэтым спісу значыцца рад відных рускіх белагвардзейцаў.

ПАДРЫХТОЎКА ФРАНКА-ГЕРМАНСКАГА „КУЛЬТУРНАГА ПАГАДНЕННЯ“

ЖЭНЕВА, 16 снежня. (БЕЛТА). У журналісцкіх колах пацвярджаюць вестку, што ў бліжэйшы час відны чыноўнік французскага міністэрства замежных спраў выязджае ў Берлін для перагавораў аб заключэнні франка-германскага «культурнага пагаднення». Першапачатковае запрашэнне было атрымана, як перадаюць, ад германскага міністэрства прапаганды, і следам за гэтым германскі міністр замежных спраў Нейрат паўтарыў запрашэнне пры асабістым спатканні з французскім міністрам Дальбосам на вакзале ў Берліне. Нязменнай умовай гэтага пагаднення, як гавораць у германскіх колах, з'яўляецца забарона германскага эміграцкага друку ва Францыі.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Па паведамленню іспанскага міністэрства абароны, аперацыі рэспубліканскіх войск, пачатыя ў Тэруэльскім сектары фронта, працягваліся 16 снежня з вялікім поспехам. Рэспубліканскія войскі ўмацавалі ўзятыя імі напярэдадні пазіцыі, а таксама занялі другія важныя пазіцыі вакол Тэруэля. Рэспубліканцы захапілі некалькі артылерыйскіх гармат, кінутых мяцежнікамі. Лік палонных, узятых рэспубліканскімі войскамі, дасягае 200 чалавек, у тым ліку 5 афіцэраў. Сярод трупаў мяцежнікаў, пакінутых на полі сражэння, падабраны трупы лейтэнанта і палкоўніка.

Рэспубліканская авіяцыя паспяхова падтрымлівала дзеянні пяхоты і артылерыі. Эскадрылля рэспубліканскіх самалётаў падвергла абстрэлу поезд мяцежнікаў, які перавозіў падмацаванні.

На іншых франтах — без змен.

НОВАЯ ПОЛЬСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ НА ГРАНІЦЫ

ШЭПЕТОЎКА, 16 снежня. (БЕЛТА). Вечарам 14 снежня, калі совецкі поезд № 33, следаваўшы з Шэпетоўкі ў Здалбунова, астанавіўся на пагранічным кантрольным блок-пасту, польскія паліцэйскія ўлады з грубай лаянкай прымусілі нашу паязную брыгаду сканцэнтравацца ў адным вагоне, пазбавіўшы яе магчымасці прыняць удзел у аглядзе састава поезда, як гэта звычайна мела месца.

Совецкая паязная брыгада была дапушчана да выканання сваіх абавязкаў толькі пасля адпраўлення поезда, калі ён ужо следаваў па польскай тэрыторыі.

Праз чатыры мінуты пасля адыходу поезда, мытны чыноўнік, які знаходзіўся ў хваставым вагоне № 219, пачаў крычаць «гарыць вагон». Праваднік тав. Яравой і галоўны кандуктар поезда тав. Кляцкі, пры ўваходзе ў службовае купэ вагона № 219, знайшлі ў тумбачцы гарачы клубок ануч і мятлу, аблітыя невядомай вадкасцю з удушлівым пахам.

Толькі дзякуючы распарадчасці праваднікa, які, не гледзячы на пагрозы польскага мытніка, схапіў рукамі палаючыя прадметы і выкінуў іх, — удалося папярэдзіць пажар у вагоне.

Па заяве знаходзіўшыхся ў вагоне пасажыраў нашаму кандуктару тав. Кляцкаму, яны бачылі, што падпал вагона ўчыніў невядомы грамадзянін высокага росту, які ўвайшоў на пагранічным пасту ў вагон № 219 разам з капітанам. Гэта асоба аказалася польскім грамадзянінам, ехаўшым гэтым-жа поездам з Кіева ў Варшаву.

Па прыбыцці поезда ў Здалбунова тав. Кляцкі склаў акт аб пажары ў вагоне № 219. Аднак, прадстаўнік польскіх чыгунак гэты акт падпісаць адмовіўся.

Пасля гэтага польскія ўлады, затрымаўшы праваднікa тав. Яравога і дазорнага тав. Плаксу, самаўладна адчапілі ад састава вагон № 219 і пакінулі яго разам з вышэй паказанымі асобамі на польскай тэрыторыі пад прадлогам неабходнасці правесці расследванне. Адначасова польскія ўлады патрабавалі прыезду совецкіх чыгуначнікаў на ст. Здалбунова для ўдзелу ў расследванні.

Улічваючы больш чым падазроны характар гэтага здарэння і немагчымасць нармальных умоў расследвання на станцыі Здалбунова, як гэта паказаў вопыт 30 лістапада, совецкія чыгуначныя ўлады адхілілі патрабаванне польскага боку і адмовіліся ад камандзіравання сваіх прадстаўнікоў на ст. Здалбунова, настойваючы на неадкладным звароце ў СССР незаконна затрыманых на польскай тэрыторыі тт. Яравога і Плаксы, а таксама вагона № 219.

УВАГА ТАСС'а. У асведамленых колах ТАСС'а паведамілі, што паўнамоцнаму прадстаўніцтву ў Варшаве даручана заявіць польскаму ўраду рэзкі пратэст супроць неспыняючыхся правакацый польскіх улад, ставячых пад пагрозу далейшае функцыянаванне чыгуначнага руху на ўчастку Здалбунова—Шэпетоўка.

ВОІНСКАЯ ПАВІННАСЦЬ ДЛЯ ЖАНЧЫН У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 15 снежня. (БЕЛТА). Агенцтва Іскра паведамляе падрабязнасці новага законапраекта аб воінскай павіннасці ў Польшчы, зацверджанага на апошнім пасяджэнні совета міністраў.

Па словах агенцтва, законапраект устанаўляе воінскую павіннасць для жанчын ва ўзросце ад 19 да 45 год, прычым маецца на ўвазе прыцягненне жанчын да так званай дапаможнай ваеннай службы ў выпадку вайны. У выпадку мабілізацыі на ваенную службу прызываецца ўся моладзь ва ўзросце ад 18 год.

Законапраект прадугледжвае стварэнне працоўнай «нацыянальнай абароны». Салдаты працоўнай «нацыянальнай абароны» не адрываюцца ад месца свайго жыхарства і ад работы, а абавязаны толькі праходзіць сістэматычнае ваеннае абучэнне.

ПЕСНІ АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Кампазітары БССР пішуць новыя песні аб слаўнай непераможнай Чырвонай Арміі і яе легендарным палкаводцу — Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву. Кампазітар Палонскі працуе над літаратурна-музыкальным мантажом «7-я Самарская». Падрыхтаваны да друку літаратурна-музычны мантаж «Граніца ў песнях» на тэксту пісьменнікаў Броўка, Глебка і Шапавалава, музыка — Любана.

Да 20-годдзя РСЧА ў выданні Дзяржаўнага выдавецтва БССР выйдзе з друку зборнік беларускіх народных і рэвалюцыйных песень, у якім прымаюць удзел 17 кампазітараў — Залатароў, Любан, Палонскі, Туранкоў, Цікоцкі і інш. У зборніку ёсць раздзелы — рэвалюцыйных песень, беларускага совецкага фальклора, рэкруцкіх і батрацкіх песень, жартоўных, бытавых, любоўных і лірычных песень— усяго каля 100 нумароў. У зборніку ўвайшлі ўрыўкі з Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну, перакладзеныя на музыку, і 12 песень беларускага народа аб Чырвонай Арміі і жалезным наркоме абароны Кліменту Варашылаву.

СТАХАНАЎСКІЯ ЗАРАБОТКІ

З кожным днём рабочыя і работніцы менскага дрэваапрацоўчага завода імя Молатава ўзнімаюць прадукцыйнасць працы. Значна павялічыўся лік стаханаўцаў. На першае снежня было 282 стаханаўцы, а зараз — 348.

Выключна высокіх паказальнікаў працы дабіўся стаханавец-столяр першага мэблевага цэха тав. Нодэльман. 1 снежня тав. Нодэльман даў 502 проц. нормы, 7 снежня — 601 проц., а 10 снежня — 685 проц.

Стаханаўская работа добра аплачваецца. За 10 дзён снежня заработак тав. Нодэльмана — 445 рублёў, тав. Шапавалава — 321 руб., тав. Більдзейкі — 308 рублёў, тав. Праўды — 304 руб., тав. Бурачэўскага — 296 руб. В.

БЛІЦТУРНІР ПА ХАКЕЮ

18 снежня менскія хакеісты адкрываюць зімовы спартыўны сезон. На катку спартыўнага таварыства «Харчавік» (Парк культуры імя Горкага) у 11 гадзін раніцы пачнецца розыгрыш эстафеты 11×100. Пасля гэтага адбудзецца бліцтурнір па хакею, у якім прымуць удзел 5 мужчынскіх і 3 жаночых каманды «Дынама», «Спартака», Інстытута фізкультуры, «Тэмпа» і «КІМ».

Пераможцы бліцтурніра атрымаюць прыз «Адкрыццё зімовага сезона».

ФІНАЛ КАМАНДНАГА ПЯРШЫНСТВА ПА БАРАЦЬБЕ І ШТАНЗЕ

Сёння ў памяшканні яўрэйскага тэатра адбудзецца фінал каманднага пяршынства БССР па барацьбе і штанзе. У фінале прымаюць удзел каманды гарадоў: Менска, Барысава, Гомеля і Бабруйска.

Сярод удзельнікаў — майстры-рэкардсмены БССР Лапідус і Мілеў.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

ДА НАПАДАЎ ЯПОНСКІХ ПІРАТАЎ НА АМЕРЫКАНСКІЯ І АНГЛІЙСКІЯ СУДНЫ

НЕЗАДАВОЛЕННЕ Ў ЗША

Н'Ю-ЁРК, 16 снежня. (БЕЛТА). Амерыканскія ўрадавыя колы лічаць, што японскія тлумачэнні па поваду патаплення амерыканскай кананеркі «Пенэй» нездавальняючыя. Атрыманая японская нота з прабачэннямі па поваду інцыдэнта не разглядаецца, як адказ на ноту ЗША. Ёсць падставы меркаваць, што прэзідэнт Рузвельт жадае атрымаць адказ непасрэдна ад японскага імператара, што магло-б зрабіць уражанне на японскія ваенныя колы, якія ў мінулым неаднаразова парушалі запэўненні японскага міністэрства замежных спраў і іншых грамадзянскіх улад.

НОТА ПРАТЭСТУ АНГЛІЙСКАГА ЎРАДА ЯПОНІІ

ЛОНДАН, 16 снежня. (БЕЛТА). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, англійскі ўрад паслаў Японіі ноту пратэсту, у якой указваецца, што ў рэзультаце нападаў японцаў на англійскія ваенныя і гандлёвыя судны «узнікаюць сур'ёзныя праблемы». Англійскі ўрад, гаворыцца ў ноце, лічыць, што належнае пакаранне асоб, адказных за памянёныя інцыдэнты, з'яўляецца адзіным метадам, пры дапамозе якога можна пазбегнуць паўтарэння падобных інцыдэнтаў у будучым. Напамінаючы японскаму ўраду аб ранейшых інцыдэнтах, у адносінах якіх японскі ўрад таксама выказваў жаль, англійскі ўрад указвае, што меры, якія прадпрымала Японія, каб пазбегнуць падобных нападаў, да гэтых пор не далі ніякіх рэзультатаў. Таму англійскі ўрад просіць паведаміць яму, якія-ж меры сапраўды прадпрыняты зараз японскім урадам для таго, каб спыніць падобныя інцыдэнты.

МАСАВЫЯ РАССТРЭЛЫ КІТАЙСКІХ САЛДАТ У НАНКІНЕ

ЛОНДАН, 16 снежня. (БЕЛТА). Карэспандэнт кансерватыўнай газеты «Дэйлі мейль» паведамляе, што пры ад'ездзе з занятага японцамі Нанкіна ён бачыў масавую казнь японцамі 300 кітайскіх салдат. Кітайскія салдаты былі выстраены перад сцяной і расстраляны. Берагі ракі,—піша ён,—завалены трупамі кітайскіх салдат, а японскія грузавікі носяцца па вуліцах, пераязджаючы праз трупы кітайцаў.

Шанхайскі карэспандэнт газеты «Таймс» піша, што 15 снежня ў Нанкіне заставалася яшчэ некалькі кітайскіх «батальёнаў смерці», якія працягваюць біцца з японцамі.

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
Ад 19 снежня
новы гукавы мастацкі фільм з эпохі грамадзянскай вайны, вытворчасці Арменкіно.
КАРО
па аповесці А. ГАЙДАРА «Школа»
У гал. ролях — засл. арт. рэсп.: А. АВЕЦІСЯН, Г. ДЖАНІБЕКЯН.
Арт.: БУНЯЦЯН, ЦАТУРАН і інш.
У ПРАГРАМЕ: НОВЫ ВЫПУСК САЮЗКІНОХРОНІКІ.
Штодзенна 4 сеансы: пачатак у 6, 7.30, 9.15 і 11 г.
Каса ад 1 г. дня.

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР
18 снежня Абан. № 72
ВОЧНАЯ СТАЎКА

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
БАЛТЫЙЦЫ.

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
«УЩЕЛЬЕ АЛАМАСОВ»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
АНЕНКАЎШЧЫНА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ТАЙГА ЗАЛАТАЯ

ПАТРЭБНЫ
ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.
Звяртацца ў рэдакцыю газеты «Звязда», да дырэктара друкарні (2-гі паверх, пакой № 3).

ВЫСТАЎКА „БССР за 20 ГОД“
(Дом урада)
БУДЗЕ АДКРЫТА да 25 СНЕЖНЯ
БЕЗ ВЫХОДНЫХ ДЗЁН.
25 снежня — УРАЧЫСТАЕ ЗАКРЫЦЦЁ.
Уваход па білетах, якія будуць спецыяльна рассылацца.
ДЫРЭКЦЫЯ ВЫСТАЎКІ «БССР ЗА 20 ГОД».

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ ПАДПІСКІ
на 1938 год
на ГАЗЕТЫ і ЖУРНАЛЫ, якія выходзяць у СССР
НЕ АДКЛАДВАЙЦЕ падпіску на апошнія дні снежня месяца!
ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на працяглыя тэрміны — 6—12 месяцаў!
ПАМЯТАЙЦЕ, своечасовая і доўгатэрміновая падпіска забяспечвае акуратнае атрыманне газет і журналаў.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА усімі райбюро Саюздруку, поштай, паштальёнамі і грамадскімі ўпаўнаважанымі друку па прадпрыемствах і ўстановах.
АДДЗЕЛ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ І ЭКСПЕДЫРАВАННЯ ДРУКУ БЕЛАРУСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ СУВЯЗІ.

Дзяржаўнае выдавецтва лёгкай прамысловасці „ГИЗЛЕГПРОМ“
АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1938 г.
на журналы „Гизлегпрома“:

1. «ЛЕГКАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 36 руб.,
на 6 мес. — 18 руб.,
на 3 мес. — 9 руб.
Штомесячны журнал па тэхніцы і эканоміцы лёгкай прамысловасці.
Журнал разлічан на інжынерна-тэхнічных работнікаў і адміністрацыйна-гаспадарчы персанал.

2. «КОЖЕВЕННО-ОБУВНАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 30 руб.,
на 6 мес. — 15 руб.,
на 3 мес. — 7 р. 50 к.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал у асноўным разлічан на інжынерна-тэхнічных работнікаў і гаспадарнікаў.

3. «ХЛОПЧАТОБУМАЖНАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 24 руб.,
на 6 мес. — 12 руб.,
на 3 мес. — 6 руб.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на гаспадарнікаў, інжынераў, тэхнікаў і эканамістаў баваўняна-папяровай прамысловасці.

4. «ТРЫКОТАЖНАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 15 руб.,
на 6 мес. — 7 р. 50 к.
на 3 мес. — 3 р. 75 к.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на інжынераў, тэхнікаў, майстраў, эканамістаў і гаспадарнікаў трыкатажных прадпрыемстваў, студэнтаў тэхнікумаў і ВНУ тэкстыльнай прамысловасці, стаханаўцаў, якія навучаюцца на курсах і ў гуртках.

5. «ШВЕЙНАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 15 руб.,
на 6 мес. — 7 р. 50 к.,
на 3 мес. — 3 р. 75 к.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на інжынерна-тэхнічных работнікаў і кваліфікаваных рабочых, выкладчыкаў навучальных устаноў і студэнтаў швейных кафедр і тэхнікумаў.

6. «ЛЬНО-ПЕНЬКО-ДЖУТОВАЯ ПРОМЫШЛЕННОСТЬ»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 15 руб.,
на 6 мес. — 7 р. 50.,
на 3 мес. — 3 р. 75 к.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на інжынерна-тэхнічных работнікаў, гаспадарнікаў, стаханаўцаў ільняной, пенька-джутавай прамысловасці і прамысловасці новых лубяных культур.

7. «ШЕРСТЯНОЕ ДЕЛО»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 24 руб.,
на 6 мес. — 12 руб.,
на 3 мес. — 6 руб.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на інжынерна-тэхнічныя кадры, кваліфікаванага рабочага-стаханаўца і на работнікаў сыравіннай базы шэрсцезагатовак.

8. «ПОЛИГРАФИЧЕСКОЕ ПРОИЗВОДСТВО»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 24 руб.,
на 6 мес. — 12 руб.,
на 3 мес. — 6 руб.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на сярэдні інжынерна-тэхнічны персанал паліграфічных прадпрыемстваў, а таксама работнікаў выдавецтваў.

9. «ШЕЛК»
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 12 мес. — 12 руб.,
на 6 мес. — 6 руб.,
на 3 мес. — 3 руб.
Штомесячны тэхніка-эканамічны журнал.
Журнал разлічан на інжынерна-тэхнічныя кадры, на кваліфікаваных рабочых-стаханаўцаў, на студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў.

ПАДПІСКУ І ГРОШЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДНАМУ З НІЖЭЙУКАЗАНЫХ АДРАСОЎ:
1) МОСКВА, ЧИСТЫЕ ПРУДЫ, № 12-а, ГИЗЛЕГПРОМ, ТОРГОВЫЙ СЕКТОР.
2) ЛЕНИНГРАД, — ЦЕНТР, ПРОСПЕКТ 25 ОКТЯБРЯ, № 28, ЛЕНИНГРАДСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ ГИЗЛЕГПРОМА.
ПАДПІСКУ МОЖНА ТАКСАМА ЗДАВАЦЬ УПАЎНАВАЖАНЫМ «ГИЗЛЕГПРОМА», ЯКІЯ МАЮЦЬ АДПАВЕДНЫЯ ПАСВЕДЧАННІ І ЎСЮДЫ НА ПОШЦЕ.

Прэзідыум Белкаапсаюза і прафком выражаюць спачуванне сям'і заўчасна памёршага супрацоўніка аб'яднання Белкаапсыравіна тав.
РОХКІНА М. М.

Адміністрацыя, мясцком і калектыў аб'яднання Белкаапсыравіна і скурана-раскройнай майстэрні з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці супрацоўніка
РОХКІНА М. М.,
паследваўшай 17 снежня г. г., і выказваюць спачуванне яго сям'і.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-252; сакратарыята — 25-169, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-055, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактары — 21-356, аб'яў — 21-845.

Ул. Галоўлітбела № К—3192. Друкарня «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., Л., Б.